Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 СНЕЖНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 236 (27846) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Колькі каштуе Новы год?**

СТАР. 3



**Жалобе тут не месца?**

СТАР. 4



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік прэм'ер-міністра Анатоль ТОЗІК:**

*«На жаль, адказнасць многіх бацькоў за выхаванне дзяцей аслаблена. Існуе погляд, што выхаваннем павінна займацца школа, дзяржава. Але выхоўваць дзяцей павінны перш за ўсё бацькі. Так, з дапамогай школы і дзяржавы. Я думаю, што трэба прыняць закон, які дакладна размяжоўваў бы паўнамоцтвы і адказнасць бацькоў, школы і іншых дзяржаўных або грамадскіх інстытутаў за выхаванне і захаванне здароўя дзяцей».*

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 12.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10860,00 | ▲ |
| Еўра | 13530,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 198,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 691,72 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Вас чакаюць дома

На выхадныя зноў абяцаюць непагадзь. А так хочацца выбрацца на прыроду, схадзіць на паляванне, парыбачыць на ўжо, здаецца, трывалым лёдзе... ДАІ папярэджвае, што лепш пакінуць аўто дома, а без зімніх шын і наогул лепш яго не заводзіць; ратавальнікі б'юць ва ўсе званы, што лёд яшчэ слабы; вопытныя егеры перасцерагаюць ад палявання ў туман і слату: можна падстрэліць чалавека або самому трапіць пад кулю. Прыслухайцеся да іх, правядзіце гэтыя шэрыя дні з сям'ёй. Жыццё і здароўе — самае дарагое, што маем.




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Надвор'е

## І НАГРЭЕ НАС АТЛАНТЫКА

### У суботу парывы ветру будуць дасягаць 15-20 м/с

**Напрыканцы тыдня тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Атлантыкі, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў пятніцу ў большасці раёнаў краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, а на асобных участках дарог будзе слізка. Месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-17 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад мінус 2 градусаў па ўсходзе да плюс 4 градусаў на захадзе краіны. На выхадныя захаваецца адносна цёплае і вільготнае надвор'е. У суботу будзе ветрана і часам чакаецца мокры снег і дождж. У асобных раёнах прагназуецца слабы галалёд і галалёдзіца на дарогах. Паўсюдна ўзмоцніцца вецер парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў. У нядзелю ўначы ў многіх раёнах, а ўдзень месцамі зноў пройдзе мокры снег і дождж. На дарогах суцэльная галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю ад 4 марозу да 1 цяпла, удзень будзе ад мінус 2 да плюс 3 градусаў.

У панядзелак чакаецца павелічэнне атмасфернага ціску, таму толькі ў асобных раёнах будзе ісці снег і мокры снег. На дарогах галалёдзіца. Стане халадней. Уначы на панядзелак падмарозіць да мінус 1-7 градусаў, а пры праясненнях — да 9 марозу. Аднак удзень будзе каля нуля.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, няўстойлівае і вільготнае надвор'е захаваецца ў нас на працягу амаль усяго наступнага тыдня. Тэмпература паветра ўначы прагназуецца ў межах 1-6 марозу, а ўдзень — ад мінус 3 градусаў да 4 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Сёння — прамая лінія**

## ХВАРОБА — НЕ ПРЫСУД

Самыя розныя пытанні, звязаныя з прафілактыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін, а таксама з арганізацыяй анкалагічнай дапамогі, можна будзе задаць падчас «прамой лініі» **галоўнаму ўрачу Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансера Уладзіміру Сцяпанавічу КАРАНІКУ**.

«Прамая лінія» адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда» **сёння, 12 снежня, з 12.00 да 13.00** па нумары **287 18 71**. Папярэднія пытанні можна пакінуць, пазваніўшы на нумар **287 18 29**.

# ТРЭБА ЖЫЦЬ І ПРАЦАВАЦЬ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка арыентуе ўрад на дасягненне больш высокіх паказчыкаў росту эканомікі, чым гэта запланавана асноўнымі дакументамі развіцця Беларусі на 2015 год. Такую задачу ён паставіў на нарадзе па актуальных пытаннях развіцця эканомікі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на будучы год сфарміраваны Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі і зацверджаны найважнейшыя параметры прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця. «Паказчыкі росту невысокія. Але хачу папярэдзіць, што гэта ніжняя планка. Мы не павінны арыентавацца на паўпрацэнта або працэнт росту. Калі ў нас будзе самая малая магчымасць, мы ў росце павінны дадаваць», — сказаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт запатрабаваў далажыць, як ідуць справы з экспартам, адзначыўшы: «Для таго, каб добра жыць, трэба прадаваць». «Хоць у цяперашняй сітуацыі, учора і прэм'ер Расіі пра гэта казаў, свет яшчэ не выйшаў з рэцэсіі, за выключэннем пары дзяржаў. Тым не менш нам ад гэтага не лягчэй, нам трэба жыць і працаваць»,— дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка закрануў таксама канфліктную сітуацыю з абмежаваннем паставак беларускага харчавання ў Расію. «Хачу падкрэсліць, што нам абсалютна не трэба выводзіць ні на якія ўзроўні тую ці іншую праблему ўзаемаадносін, асабліва з Расійскай Федэрацыяй. Таму што гэта нам проста невыгадна, нам гэтага не трэба. І самае галоўнае — не мы былі прычынай такога канфлікту», — адзначыў Прэзідэнт. «Я хацеў бы параіць разумным расійскім палітолагам і журналістам шукаць прычыну не ў Беларусі, а шукаць яе недзе там, у Маскве. Але гэта іх праблема», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да ўрада, адзначыў, што хацеў бы пачуць, як выконваецца яго распараджэнне аб вырашэнні гэтай сітуацыі, а таксама наколькі былі абгрунтаваны ўстаноўленыя расійскім бокам абмежаванні. Акрамя таго, Прэзідэнт пацікавіўся падрабязнасцямі пасяджэння Савета ЕЭК, які адбыўся напярэдадні, прынятымі на ім рашэннямі, іх рэалізацыяй. Кіраўнік дзяржавы закрануў яшчэ адну тэму — ратыфікацыю Арменіяй дагавора аб далучэнні да ЕАЭС.

На нарадзе ўрадам, Нацыянальным банкам і Адміністрацыяй Прэзідэнта былі дадзены ацэнкі бягучай сітуацыі, якая складваецца на знешніх рынках. Асаблівая ўвага была нададзена расійскаму рынку, дзе склалася часовая сітуацыя, калі курс расійскага рубля змяняецца хутка, а цэны за ім не паспяваюць. Безумоўна, гэта ўплывае на беларускіх экспарцёраў. Дзяржава акажа падтрымку экспарцёрам, якія гандлююць з Расійскай Федэрацыяй, у сувязі з сітуацыяй, якая там часова склалася.

У Беларусі доля экспарту ў Расію складае ўсяго 40%. Як дакладвае ўрад, сітуацыя кантралюецца, больш за тое, за 10 месяцаў гэтага года скарацілася дэбіторская запазычанасць і запасы гатовай прадукцыі на складах. Скарачэнне склала каля $1 млрд. Чакаецца, што, хутчэй за ўсё, у бліжэйшы час у Расіі можа адбыцца інфляцыйны ўсплёск, і гэта дасць магчымасць часткова кампенсаваць тыя цяжкасці, якія ўзніклі ў экспарцёраў.

Па выніках нарады кіраўнік дзяржавы даў шэраг даручэнняў у сувязі з бягучай сітуацыяй. У прыватнасці, Прэзідэнт запатрабаваў больш актыўна дыверсіфікаваць экспарт. Адпаведныя задачы пастаўлены ўраду, Міністэрству замежных спраў, пасольствам і іх гандлёва-эканамічным службам. Аднак бізнес пачынае і сам рабіць пэўныя крокі ў гэтым кірунку. Так, за 9 месяцаў гэтага года тэмпы росту экспарту Беларусі ў трэція краіны (не Расію) перавышаюць як леташнія паказчыкі, так і тэмпы росту гандлю ў Расію. Тут роля ўрада заключаецца ў аказанні своечасовай падтрымкі, каб гэты рух падхапіць і дапамагчы перанакіраваць гандлёвыя патокі ў больш выгадныя краіны.

Аляксандр Лукашэнка таксама паставіў задачу па зніжэнні сабекошту на дзяржпрадпрыемствах і ў цэлым у дзяржапараце.

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

18 снежня 2014 года ў 14.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі, 19 снежня 2014 года ў 15.00 — заключнае пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.


Уважаемые акционеры открытого акционерного общества

**«Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»**

**22 декабря 2014 г. в 10.00**

**состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск».**

Собрание пройдет по адресу Общества:

**г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об утверждении разделительного баланса.
2. Об изменении Устава Общества.
3. О совершении крупной сделки.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 15 по 21 декабря 2014 г. (время работы с 8.30 до 17.30) либо 22 декабря 2014 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66.

**Регистрация участников собрания – с 9.00 до 9.45 по месту проведения собрания.**

Реестр владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 12 декабря 2014 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 300000398 **Наблюдательный совет**


■ З першых вуснаў

# КАРЫСТАЦЦА ВАРТА АЙЧЫННЫМІ ЛЕКАМІ

## А жыллё трэба шукаць там, дзе ёсць праца



**Такую думку выказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ падчас анлайн-канферэнцыі на сайце «СБ. Беларусь сегодня».**

Як адзначыў Аляксандр Радзькоў, урад Беларусі арыентаваны на вырашэнне жыллёвых пытанняў грамадзян, але будаваць, на яго думку, трэба так, каб развівалася інфраструктура ўсёй краіны, а не толькі Мінска або абласных цэнтраў, таму акцэнт цяпер зроблены на ўзвядзенне арэнднага жылля: «Яно прынцыпова вырашае праблемы занятасці, працы і жылля, але мы прывыклі шукаць працу каля таго месца, дзе жывем, а ва ўсім свеце наадварот. Натуральна, да гэтай пазіцыі трэба псіхалагічна прыйсці, мы будзем больш будаваць арэнднага жылля і прапаноўваць яго і медыкам, і настаўнікам, дзе ў іх ёсць праца». Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі падкрэсліў, што жыць у арэндным жыллі значна танней, чым здымаць кватэру ў прыватнага арэндадаўцы.

### БЛІЖЭЙ ДА СПРАВЫ

Паводле слоў Аляксандра Радзькова, маладыя спецыялісты, якія прыходзяць на прадпрыемства, павінны працягваць сваю падрыхтоўку. Часта на прадпрыемствах магчымасці маладых спецыялістаў запатрабаваны не ў поўнай меры, у той час як стратэгічна важна гэта выкарыстоўваць. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прывёў у прыклад амерыканскую сістэму бакалаўрыяту, якая прадугледжвае, што чалавек на працягу трох гадоў атрымлівае базавую аснову па адпаведнай спецыяльнасці, але яшчэ не з'яўляецца спецыялістам. А потым атрымлівае адукацыю непасрэдна на фірме, у банку, на заводзе. Калі гаворка ідзе пра далейшую адукацыю, тады чалавек пераходзіць на магістарскі ўзровень.

Беларуская ж сістэма, якая захавалася з савецкага перыяду, толькі падыходзіць да падобнай схемы. Аднак пераход да такой сістэмы ў Беларусі адбудзецца праз некаторы час, лічыць Аляксандр Радзькоў.

### ЭЛЕКТРОННЫЯ РЭЦЭПТЫ

Першы намеснік кіраўніка адміністрацыі закрануў таксама тэму ўзмацнення жорсткасці кантролю за рэцэптурным водпускам: «Не ўсё ў гэтым пытанні адназначна. З аднаго боку, раптам узарвалі грамадскую думку, усе пайшлі і нагрузілі лекараў выпіскай рэцэптаў. З іншага боку, усё зроблена ў інтарэсах хворага, каб ён не карыстаўся год аднымі і тымі ж лекамі — раптам у яго змянілася дынаміка хваробы?» — растлумачыў Аляксандр Радзькоў.

Дарэчы, ён лічыць, што перад такімі дзеяннямі неабходна было падрыхтаваць саму сітуацыю: укараніць сістэму электронных рэцэптаў, падрыхтаваць да гэтага лекараў і сеткі аптэк, папярэдне растлумачыць грамадзянам, для чаго гэта робіцца.

Адказваючы на пытанне, чаму ў аптэках не заўсёды ёсць імпартныя лекавыя сродкі, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што, на яго погляд, пры куплі лекаў павінны прапаноўвацца і айчынныя, і імпартныя медпрэпараты. «Хоць я раю аддаваць перавагу беларускім. Паверце, яны высокай якасці, іх вытворчасць знаходзіцца пад належным кантролем. А вось праверыць вытворчасць імпартных лекавых сродкаў мы не можам. Былі выпадкі, калі завозіліся няякасныя прэпараты», — адзначыў Аляксандр Радзькоў.

### РАШУЧА І АРГАНІЗАВАНА

«У барацьбе з дармаедствам патрэбны рашучыя крокі і арганізаванасць усіх структур: ад МУС да кіраўнікоў прадпрыемстваў і мясцовай улады», — сказаў Аляксандр Радзькоў. Ён растлумачыў, што ёсць людзі, якія проста шукаюць сабе магчымасць зарабіць, у тым ліку і за мяжой, але пазбягаюць выплаты падаткаў. «У той жа час такія грамадзяне выкарыстоўваюць нас з вамі і грамадства, каб мы аплачвалі ім дзіцячыя садкі, школы і іншае. Такога чалавека наўрад ці можна назваць дармаедам — ён жа працуе. Але і з імі трэба рашуча працаваць, каб яны разумелі сваю адказнасць перад крайнай, сям'ёй, сваімі дзецьмі, плацілі падаткі».

З іншага боку, паводле слоў Аляксандра Радзькова, ёсць яшчэ адна катэгорыя так званых дармаедаў — грамадзяне без пэўнага месца жыхарства і п'яніцы. «Таму Прэзідэнт даў даручэнне: дакладна разабрацца — ад каго дамагчыся выплаты падаткаў, каго прымусіць працаваць для яго ж карысці, каб не дэградаваў і не памёр», — дадаў Аляксандр Радзькоў.

**Паводле інфармацыі БЕЛТА**

■ Парламенцкі дзённік

# Чатыры прыярытэты на будучы год

## Зніжэнне доўгу, фінансаванне адукацыі і аховы здароўя, падтрымка мадэрнізацыі і экспарту і забеспячэнне абараназдольнасці

**Гэтыя задачы названы галоўнымі пры фарміраванні бюджэту нашай краіны на наступны год. Нягледзячы на актыўную работу дэпутатаў у падрыхтоўцы законапраекта аб рэспубліканскім бюджэце і досыць бурнае абмеркаванне гэтага дакумента ў камісіях напярэдадні, разгляд дакумента ў Авальнай зале быў не менш эмацыйным, ды і аднагалоснасці сярод дэпутатаў на гэты раз не было. Тым не менш Палата прадстаўнікоў прыняла ўчора праект бюджэту на 2015 год у першым чытанні.**

### АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ СЦЭНАРЫІ

Агульная сума даходаў кансалідаванага бюджэту прагназуецца ў памеры Br252,9 трлн, расходы запланаваны ў суме Br237,9 трлн.

— Бюджэт разлічваўся, зыходзячы з цаны $83 за барэль нафты, — расказаў журналістам **міністр фінансаў Уладзімір АМАРЫН**. — Мы разумеем, што цяпер цана ніжэйшая, але ніхто не можа сказаць, якая яна будзе ў 2015 годзе... Калі рэальнасць акажацца горшай або лепшай, у нас прадугледжаны механізмы, якія мы задзейнічаем і ў тым, і ў другім выпадку.

У расходнай частцы бюджэту прадугледжана $3 мільярды на пагашэнні асноўнага знешняга доўгу, акрамя таго, плануецца прыцягнуць знешніе фінансаванне ў суме аднаго мільярда долараў на абслугоўванне гэтага доўгу. «Гэта могуць быць і еўрабонды, і іншыя прыцягненні — двухбаковыя, сіндыкаваныя крэдыты», — патлумачыў міністр.

Па ўнутраных пазыках прадугледжаны сродкі на суму больш за 8 трлн рублёў.

— З улікам існуючай эканамічнай сітуацыі падыход да фарміравання бюджэту можа быць толькі адзін — эканамічнасць і эфектыўнасць расходавання бюджэтных сродкаў, — падкрэсліла **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла ДАБРЫНІНА**. — Гэта патрабуе рэалізацыі прынцыпаў жорсткай эканоміі, выкарыстання існуючых рэзерваў на ўсіх узроўнях бюджэтнай сістэмы.

### САЦЫЯЛЬНЫ ХАРАКТАР

Разам з тым **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Ларыса БАГДАНОВІЧ** звярнула ўвагу на тое, што львіная доля сродкаў кансалідаванага бюджэту накіроўваецца ў сацыяльную сферу.

— Мяне радуе, што плануецца рост паступленняў да выканання бюджэту 2014 года на фізічную культуру і спорт, сацыяльную палітыку, культуру і СМІ, — сказала яна. — Захаваны дасягнуты ўзровень бюджэтнага фінансавання да ВУП у ахове здароўя і адукацыі. Важна, што ў бюджэце 2015 года ўжо разлічаны і запланаваны сродкі на навіны сацыяльнай палітыкі нашай краіны: Br1,8 трлн на фарміраванне «сямейнага капіталу», а таксама Br1,6 трлн — на новы від дапамог сем'ям, дзе ёсць двое і больш дзяцей, калі адзін з бацькоў даглядае малое да 3-х гадоў. Гэта істотная падтрымка сем'ям. Не менш важна, што ў юбілейны год Вялікай Перамогі больш за 300 млрд рублёў запланаваны на выплаты аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і асобнай катэгорыі грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. Але самае галоўнае — запланаваны сродкі на павышэнне заробкаў, пенсій, стыпендый на 17-20%, што дазволіць зменшыць да мінімуму наступствы інфляцыі і захаваць дасягнуты ўзровень якасці жыцця нашых грамадзян.

### ПАДАТКОВАЯ НАГРУЗКА

Ніжняя палата парламента таксама прыняла ў першым чытанні законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс. Законапраект прадугледжвае павышэнне стаўкі падаходнага падатку, павелічэнне стаўкі акцызаў на ўсе групы падакцызных тавараў, за выключэннем аўтамабільнага паліва і піва. Акрамя таго, плануецца павялічыць стаўку падатку на прыбытак для банкаў і страхавых арганізацый. У мэтах пашырэння рэсурснай базы бюджэтаў прапануецца ўвесці спецыяльны збор за права экспарту сырой нафты, якая здабываецца ў Беларусі.

Узровень падатковай нагрузкі ў 2015 годзе без уліку мытных пошлін складзе 23,6 працэнта ВУП і не вырасце ў параўнанні з 2014 годам. Законапраектам прадугледжваецца спрашчэнне падатковага адміністравання і іншыя захады, якія даюць магчымасць спрасціць прымяненне падатковага заканадаўства.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Аляксандр МЯКІННІК**, які выступіў судакладчыкам па законапраекце, дадаў, што дакумент прадастаўляе пенсіянерам, інвалідам I і II групы льготу 50 працэнтаў па выплаце дзяржаўнай пошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху.

### «СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ»

Праект бюджэту Фонду сацыяльнай абароны быў разгледжаны адразу ў двух чытаннях. Расходная частка гэтага Фонду не будзе зменшана і складзе 114,2 трлн рублёў. Прафіцыт запланаваны ў памеры Br1,6 млрд. Пры гэтым Br87 трлн будуць выдзелены на павышэнне пенсій і на іх своечасовую выплату ў поўным аб'ёме. Сярэдні памер працоўнай пенсіі ў 2015 годзе складзе Br2 млн 883 тыс. «Адносна ВУП расходы на пенсійныя выплаты складаюць практычна 10 працэнтаў», — адзначыла **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**.

У бюджэт закладзены гарантыі таго, што пенсіі не будуць ніжэйшыя 40% ад сярэдняга заробку па краіне.

Другі самы вялікі артыкул расходаў Фонду сацыяльнай абароны — Br24,5 трлн — дапамога сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

— «Сямейны капітал» будзе фінансавацца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, але ідэалогія такая, што дадатковыя меры падтрымкі не павінны нарадзжаць меркантыльныя інтарэсы пры нараджэнні дзяцей, — пракаментавала журналістам гэты артыкул выдаткаў Марыяна Шчоткіна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Знешняя палітыка

# ЕХАЦЬ У ІЗРАІЛЬ БЕЗ ВІЗЫ ПАКУЛЬ РАНА

## А наша пасольства ў Лівіі можа адкрыцца зноў

**Пагадненне аб адмене віз паміж урадам нашай краіны і ўрадам Ізраіля было падпісана яшчэ ў верасні, аднак пакуль што ў сілу дакумент не ўступіў. Па інфармацыі, якую на брыфінгу агучыў Дзмітрый Міронччык, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС, зараз бакі ажыццяўляюць унутрыдзяржаўныя працэдуры па ратыфікацыі пагаднення.**

9 снежня адбылося пасяджэнне пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў беларускага парламента па міжнародных справах, на якім разглядаўся праект адпаведнага закона аб ратыфікацыі. А ўчора яго прынялі на чарговым пасяджэнні ніжняй палаты і накіравалі ў Савет Рэспублікі.

— З ізраільскага боку пытанне аб ратыфікацыі пагаднення было разгледжана 9 снежня ў парламенцкай камісіі па ўнутраных справах, — паведаміў прадстаўнік МЗС. — Чакаецца, што на працягу тыдня гэтае пытанне будзе ўключана ў парадак дня пасяджэння кабінета міністраў.

Па словах Дзмітрыя Міронччыка, пагадненне ўступіць у сілу праз 90 дзён з даты атрымання па дыпламатычных каналах апошняга пісьмовага паведамлення, якім бакі інфармуюць адзін аднаго аб выкананні ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для ўступлення ў сілу пагаднення аб адмене віз.

— Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь пасля ўзгаднення з ізраільскім бокам дадаткова паведаміць дакладную дату ўступлення ў сілу пагаднення, — паведаміў прэс-сакратар МЗС. — Просім улічваць гэтую інфармацыю пры планаванні паездак у Дзяржаву Ізраіль.

### НАШЫ ДЫПЛАМАТЫ ВЫЕХАЛІ З ЛІВІІ

Не так даўно з'явілася інфармацыя аб закрыцці нашага пасольства ў Лівіі. Каменціруючы гэтую інфармацыю на брыфінгу, Дзмітрый Міронччык паведаміў, што супрацоўнікі беларускага пасольства ў гэтай краіне былі эвакуяваны ў Туніс пасля абвастрэння ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Лівіі яшчэ ў пачатку жніўня.

Як паведаміў прэс-сакратар МЗС, некаторы час пасольства функцыянавала ў Тунісе, але на момант прыняцця пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб закрыцці гэтай замежнай установы яго супрацоўнікі, разам з вывезенай маёмасцю, ужо пакінулі гэту краіну.

— Павінен сказаць, што лівійскі бок з улікам развіцця сітуацыі ў краіне з паразуменнем сустрэў рашэнне аб закрыцці беларускага дыпламатычнага прадстаўніцтва, — заявіў Дзмітрый Міронччык. — Адпаведная пазіцыя была агучана часовым паверaным па справах Лівіі ў Рэспубліцы Беларусь падчас сустрэчы ў МЗС, што адбылася 8 снежня. Адзначу, што Лівія разглядаецца нашай краінай у якасці важнага, традыцыйнага і перспектыўнага партнёра на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы. Таму беларускі бок спадзяецца на як мага больш хуткае ўрэгуляванне сітуацыі ў гэтай краіне шляхам унутрынацыянальнага дыялогу. Мы будзем гатовы вярнуцца да пытання аб аднаўленні працы дыппрадстаўніцтва пасля ўсталявання міру на лівійскай зямлі.

### КРАІНЫ — УДЗЕЛЬНІЦЫ СНД АБ'ЯДНАЮЦЬ СУПРАЦЬ ПАВЕТРАНУЮ АБАРОНУ?

Сёння ў Маскве праходзіць 64-е пасяджэнне Эканамічнага савета Садружнасці незалежных дзяржаў. Дэлегацыю нашай краіны ўзначальвае Сяргей Румас, старшыня Эканамічнага савета СНД.

— Падчас пасяджэння будзе разгледжана 17 пытанняў, якія датычацца пашырэння супрацоўніцтва ў СНД у розных галінах, — адзначыў Дзмітрый Міронччык. — Сярод іх — унесеныя беларускім бокам: «Аб санітарным і ветэрынарна-санітарным кантролі ў асобных дзяржавах СНД» і «Аб нераспаўсюджанні ўводзімых у аднабаковым парадку мер, што закранаюць знешні гандаль таварамі, у дачыненні да тавараў, якія перамяшчаюцца ў адпаведнасці з мытнай працэдурай мытнага транзіту».

Па інфармацыі, агучанай на брыфінгу, праекты рашэнняў Эканамічнага савета прадугледжваюць стварэнне рабочых груп для адпрацоўкі механізмаў разбору праблемных пытанняў, што ўзнікаюць у гэтых сферах.

— Блок пытанняў будзе прысвечаны праектам дакументаў у сферах стандартызацыі, транспартнай бяспекі, міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва, падрыхтоўкі кадраў у галіне інтэлектуальнай уласнасці, — паведаміў прадстаўнік дыпламатычнага ведамства краіны. — Традыцыйна ў парадку дня прысутнічае шэраг фінансавых пытанняў. Так, плануецца абмеркаванне каштарысаў даходаў і выдаткаў Выканаўчага камітэта СНД, Антытэрарыстычнага цэнтра СНД і Міждзяржаўнага статыстычнага камітэта СНД. Удзельнікі пасяджэння таксама нададуць увагу фінансаванню аб'яднанай супрацьпаветранай абароны дзяржаў — удзельніц аб'яднання.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Светлая радасць

# ЧАКАННЕ ЦУДАЎ, КАЗКІ, ПАДАРУНКАЎ

**Сёння ў Мінску пачалася рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці», падчас якой каля 1,5 млн дзяцей атрымаюць падарункі. Гэта адна з самых добрых і значных навагодніх падзей у нашай краіне, у якой прымае ўдзел не толькі вышэйшае кіраўніцтва і прадстаўнікі мясцовых органаў улады, але і грамадскія арганізацыі, дабрачынныя фонды, розныя прадпрыемствы і звычайныя грамадзяне.**

— Сёння акцыя стала значнай з'явай у грамадстве, — падкрэсліў **намеснік міністра адукацыі Беларусі Віктар ЯКЖЫК**.— Яна прыцягвае ўвагу да праблем дзяцінства, заклікае аказваць дапамогу самым безабаронным катэгорыям малых. Акцыя «Нашы дзеці» стала ўжо місіяй нашых людзей, іх жаданнем дапамагчы, падзяліць з малымі радасць ад чакання цуду, казкі і навагодніх падарункаў.

Гісторыя праекта распачынаецца з 1995 года, калі Міністэрства адукацыі правяло першую акцыю «Нашы дзеці». Ужо з 2012 года назіраецца штогадовае павелічэнне ўдзельнікаў акцыі. Як адзначыў намеснік міністра адукацыі, у 2013 годзе на падарункі дзецям па ўсёй краіне, было пераведзена амаль 23 мільярды беларускіх рублёў. І адчувальная частка пераводаў — дапамога звычайных беларусаў. Падчас мінулай акцыі прайшло 6,5 тысячы святочных мерапрыемстваў, каля 900 тысяч маленькіх беларусаў атрымалі віншаванні. Сёлета ўдзел у ёй пацвердзілі ўжо больш за 90 структур і арганізацый.

Акцыя стала сапраўдным грамадзянскім рухам. Самыя розныя людзі падчас навагодніх вакацый наведваюць прытулкі для дзяцей, дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты і дораць падарункі. Мерапрыемствы пачынаюцца з фіналу рэспубліканскага конкурсу Дзядоў Маразоў і Снягурак, які праходзіць у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. Таксама сёння дэлегацыя прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання адправіцца з віншаваннямі ў кобрынскую дзіцячую вёску.

Цэнтральнай падзеяй у вялізнай святочнай праграме традыцыйна стане навагодні спектакль у Палацы Рэспублікі, які адбудзецца 24 снежня. Туды запрошаны 2370 дзяцей. Гэта дзеці-сіроты, дзеці, якія засталі без апекі бацькоў, пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў; навучэнцы, якія дасягнулі поспехаў у вучобе ці грамадскай дзейнасці.

Аднак самым лепшым падарункам для дзяцей-сірот, безумоўна, стануць бацькі.

— Ужо ёсць добрая тэндэнцыя ў перададленні сацыяльнага сіроцтва, — адзначыў Віктар Якжык.— Колькасць дзяцей, якія знаходзяцца ва ўстановах інтэрнатнага тыпу, значна скарацілася. Сёння з 23 081 дзіцяці ў рэспубліканскім банку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі, — 18179 жывуць у апякунскіх, прыёмных сем'ях і дзіцячых дамах сямейнага тыпу. У канцы 2020 года плануецца пакінуць мінімум установ для дзяцей-сірот.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ**




■ Будзе свята!

# ШЭСЦЬ ЛІТРАЎ ШАМПАНСКАГА І ЦЫГАНЫ З МЯДЗВЕДЗЯМІ

## Колькі каштуе святкаванне Новага года




**«25, 31 снежня і 7 студзеня гандлёвыя аб'екты будуць абслугоўваць грамадзян па рэжыме звычайнага рабочага дня, — паведаміў намеснік міністра гандлю Вячаслаў ДРАГУН. — У першы дзень новага года харчовыя крамы прымуць пакупнікоў з 10 да 18 гадзін, а для нехарчовых ён стане выхадным. Акрамя таго, з 15 снежня па 1 студзеня аб'екты грамадскага харчавання плануюць працаваць без выхадных; рэстараны і кавярні будуць адчыненыя для наведвальнікаў да 6 гадзін, за выключэннем размешчаных у жылых будынках».**

### КАСЦЮМЫ, МАСКІ І МЯККАЯ «КАЗА»...

З 20 па 31 снежня пачнецца продаж елак. На базарах сталіцы жывыя дрэўцы можна будзе набыць па наступных коштах: да аднаго метра — ад 70 да 120 тысяч рублёў, да двух — ад 80 да 150 тысяч рублёў, да трох — ад 90 да 180 тысяч рублёў. Тэндэнцыя апошніх гадоў — зніжэнне аб'ёмаў продажу натуральных елак, таму абавязкова будзе прадстаўлены вялікі асартымент штучных навагодніх дрэў. Сярэднія кошты на іх такія:

✓ да 50 сантыметраў — 50 — 70 тысяч рублёў,
✓ да 1 метра — 77 — 200 тысяч рублёў,
✓ да 2 метраў — 150 да 800 тысяч рублёў,
✓ да 3 метраў — ад 960 да 1700 тысяч рублёў.

Агулам па краіне з'явіцца больш за 600 ёлачных базараў. Але якое святочнае дрэва без упрыгажэнняў? Дарэчы, сімвал наступаючага года — мяккая цацка «каза» альбо «авечка» — абыдзецца ад 35 да 98 тысяч рублёў. Касцюмы Дзеда Мароза і Снягуркі айчыннай вытворчасці будуць у наяўнасці па цане ад 673 да 954 тысяч рублёў, беларускія карнавальныя касцюмы і маскарадныя маскі — ад 77 да 334 тысяч рублёў.

✓ Гірлянды, мішура — 11—58 тысяч рублёў
✓ «Дождждык» — 3850 — 5400 рублёў
✓ Шкляныя ёлачныя цацкі — ад 11 да 200 тысяч рублёў
✓ «Агеньчыкі» — ад 120 да 440 тысяч рублёў
✓ Хлапушкі — 6—84 тысячы рублёў

### ШАМПАНСКАЕ І ПА ТРЫ, І ПА ШЭСЦЬ

Асартымент салодкіх навагодніх падарункаў налічвае больш за 50 відаў (вагой ад 300 грамаў да 2,5 кілаграма). Набыць пачастункі можна як за 24 тысячы рублёў, так і за 300 тысяч — розніца залежыць ад асартыменту і вагі. Паўкілаграмовы набор цукерак ад «Камунаркі» аблегчыць кашалёк у сярэднім на 63 тысячы, ад «Спартака» — на 68 тысяч. Кілаграмовы пакунак цукерак разам з мяккай цацкай можна знайсці ў сярэднім за 270—280 тысяч рублёў.

Мінскі завод пеністых він прапануе больш за 40 найменняў він, разам з тым і шампанскае, якое каштуе ад 39,9 да 55 тысяч рублёў за 0,75 літра. Можна будзе набыць бутэлькі павялічаных аб'ёмаў — па тры і шэсць літраў. Імпартнае пеністае віно ёсць па кошце ад 97 да 158 тысяч рублёў. Цэны на іншыя сімвалы Новага года, без якіх не абыдзецца святочны стол (за кілаграм, калі не пазначана іншае)

✓ ікра чырвоная — 70 тысяч рублёў за 90 грамаў, 109 тысяч за 140 грамаў;
✓ філе стронгі — 264 тысячы рублёў;
✓ філе ласося — 221,8 тысячы рублёў;
✓ мандарыны — ад 13 да 22 тысяч рублёў;
✓ хурма — ад 22,9 да 31,9 тысячы рублёў.

### ПАСПЕЦЬ ЗАКАЗАЦЬ СТОЛІК У КАВЯРНІ

Хоць да Новага года засталося больш за два тыдні, мінчане паспелі забраніраваць на святочныя даты да 85% месцаў у кавярнях і рэстаранах сталіцы. Па статыстыцы, пачынаючы з 20 снежня, установы грамадскага харчавання даводзяцца абслугоўваць да 20 тысяч наведвальнікаў за дзень. Сярэдні рахунак на вячэру і забаўляльную праграму складае ад 400 тысяч рублёў з чалавека. Мінімальная сума, з якой можна разлічваць на кампанію Дзеда Мароза і Снягуркі, — 900 тысяч за дзве наведвальнікаў. Прысутнасць цыганоў і мядзведзяў пад Новы год абыдзецца ў 1,6 мільёна рублёў за дваіх. Адзначыць навагоднюю ноч у кавярні альбо рэстаране можна ад мільёна рублёў з чалавека.

Кошт дзіцячага ранішніка ў сярэднім будзе 200 тысяч рублёў і вышэйшым у залежнасці ад паслуг. Напрыклад, за 170 тысяч можна атрымаць у комплексе святочнае меню, забаўляльную праграму і падарунак.

### НЕ ПРАПУСЦІ СВАЕ ЗНІЖКІ!

Ужо сёння мінчане і госці сталіцы могуць набыць прадукцыю вядучых беларускіх вытворцаў, а таксама імпартныя тавары па прывабных коштах. З 10 снежня пачаліся рэкламныя акцыі ад гандлёвых арганізацый Гродзенскай вобласці. Напрыклад, фабрыка «Нёман» будзе праводзіць распродаж абутку больш за 30 відаў са зніжкай у 30%. Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў» прапануе акцыю «Тэрыторыя забойных коштаў». ААТ «Камінтэрн» зробіць усім пакупнікам падарунак у перыяд з 25 снежня па 7 студзеня.

ААТ «Рэчыцкі тэкстыль» дае зніжкі на ўласную прадукцыю да 50%, «Вітэкс» прапануе выгадныя кошты на асобныя віды прадукцыі, «Элема» зробіць падарунак усім пакупнікам зімовай калекцыі, Мінская шпалерная фабрыка прадасць прадукцыю без гандлёвай надбаўкі.

А 28 снежня ў гандлёвых арганізацыях краіны пройдзе акцыя «Адзіны дзень зніжак». «Цэнапад» у 15—20% закране нехарчовыя тавары.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ Анатомія жыцця

# MEMENTO MORI

## Ці варта баяцца рытуальных залаў побач з домам?

**Калі жыхары сталічнага раёна Лошыца даведаліся пра адкрыццё ў мясцовым Доме быту пахавальнай залы і крамы рытуальных паслуг, то палічылі гэта сапраўднай катастрофай. Расклеілі ў пад'ездах улёткі, дзе заклікалі суседзяў далучыцца да пратэсту. «Толькі ўявіце, у што ператворыцца жыццё найбліжэйшых дамоў. Бясконцыя пахавальныя працэсіі і ў будні, і ў святы. Ці хочам мы, каб нашы дзеці раслі пад гукі пахавальных маршаў?» — абураліся гараджане. Каб толькі не бачыць жалобы па суседстве, людзі сабралі больш за дзве тысячы подпісаў.**





По словах **загадчыцы псіхалагічнай лабараторыі МГПНД Тацціны УШАКЕВІЧ**, баяцца суседства з пахавальнымі заламі не варта:

— Ці адаб'ецца гэта на псіхіцы дзіцяці, залежыць ад бацькоў, іх стаўлення да сітуацыі. Вядома, мы стараемся адгарадзіць сваіх малых ад усяго дрэннага. Але ад смерці не схаваешся. Хоць у нашым грамадстве гэтая тэма — табу. Пра смерць мала пішуць, пра яе не прынята гаварыць.

### НЯБОЖЧЫКАМ ТУТ НЕ МЕСЦА?

Аргументаў супраць у жыхароў раёна хапала:

— Мы будавалі кватэры па адным кошце, а цяпер ходзяць чуткі, што з-за адкрыцця пахавальнай залы наша жыллё значна патаннее. Як гэта разумець? Вяртайце нам грошы!

Рытуальную краму і халадзільную камеру збіраліся змясціць у закінутым падвале. Памяшканне адпавядала ўсім патрабаванням і санітарным нормам. Некалі там праектавалася грамадская прыбіральня, якая так і не была зроблена. Аднак работнікі Дома быту былі не задаволены.

— У будынку знаходзіцца некалькі прадпрыемстваў: хімчыстка, рамонт адзення і абутку, ювелірная майстэрня, — кажа адна з работніц цырульні. — Як нам працаваць, калі мы будзем ведаць, што на цокальным паверсе — нябожчыкі? Да нас нявесты прыходзяць прычоску на вяселле рабіць, а тут жалобныя працэсіі адбываюцца.

Недалёка ад памяшкання, дзе планавалася адкрыць рытуальную залу, стаяць дзве школы, два дзіцячыя садкі і гульнявая пляцоўка. Бацькі не хацелі, каб іх дзеці (ды і самі яны) кожны дзень па дарозе да дому бачылі труны. Баяліся, што гэта не лепшым чынам адаб'ецца на псіхіцы.

Урэшце пад націскам людзей рашэнне аб адкрыцці залы для рытуальных паслуг адмянілі. Адміністрацыя Ленінскага раёна запэўніла абураных жыхароў Лошыцы, што ніякіх халадзільных камер у Доме быту не будзе. Маўляў, не хочаце — ваша справа.

Прэтэнзіі і негатыўны настрой гараджан зразумецъ, вядома, можна. Большасць з іх хацела б хутчэй убачыць побач з домам лазню ці «трэнажорку». Аднак, згодна з Генеральным планам развіцця Мінска, у кожным раёне сталіцы павінны быць зроблены рытуальныя залы і крамы з адпаведнымі таварамі. Тым больш што па выніках маніторынгу, які правеў Мінскі НДІ ў 2008 годзе, сярод пажаданняў жыхароў Чыжоўкі, Лошыцы, Серабранкі і Зялёнага Лугу было стварэнне ўмоў для развітання з памерлымі.

— Разумееце, мы ж не проста так вырашылі адкрыць залу для рытуальных паслуг, — гаворыць **начальнік упраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Дзмітрый ЯНЧЫК**. — Да нас паступалі прапановы ад мясцовых жыхароў: людзям нязручна ездзіць праз увесь горад, каб у нармальных умовах развітацца з памерлымі.

— Насельніцтва Мінска зараз расце вельмі хутка, і тых пахавальных залаў, што ёсць у горадзе, ужо не хапае. У кожным раёне патрэбна свая зала, а можа, і дзве, — тлумачыць **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце КУП «Спецкамбінат КПА» Сяргей ТУР**.

### ЗАКОНЫ БУЙНОГА ГОРАДА

Рытуальныя залы ў горадзе — такая ж неабходная частка інфраструктуры, як прадуктовая крама ці банкаўскае аддзяленне. Калі ў вёсцы зладзіць памінкі можна ва ўласнай хаце, то ў кватэры гэта вельмі складана.

— Што рабіць, калі ты на чатырнаццатым паверсе жывеш? Па лесвіцы гэтага нябожчыка спускаць ці ў ліфце везці? Уявіце рэакцыю сваіх суседзяў. Напэўна, больш цывілізавана будзе, калі памерлага падрыхтуюць да пахавання ў спецыяльным памяшканні, вывезуць у закрытым аўтамабілі. У Маскве і Санкт-Пецярбургу ўвогуле забаронена трымаць нябожчыкаў дома. Калі раптам выявіцца якая інфекцыя, то яна хутчэй распаўсюдзіцца ў кватэры, чым у халадзільнай камеры, — тлумачыць Дзмітрый Янчык.

У сталічным Доме быту на Альшэўскага (недалёка ад праспекта) ужо колькі гадоў месцяцца дзве пахавальныя залы. Тут жа знаходзіцца ЗАГС, салон кветак, салярый. І ніхто не скардзіцца. З вянкамі людзі дык наогул ледзь не кожны дзень у аўтобусах ездзяць. Залы развітання ёсць і ў невялікіх гарадах. Напрыклад, у Лідзе працуе Дом смутку. Побач з будынкам стаяць шматпавярховікі, а праз дарогу — прыватны сектар.

— Паслугі рытуальных бюро цяпер нават у вёсках запатрабаваны, — кажа Дзмітрый Янчык. — У некаторых населеных пунктах людзей амаль не засталося. Труну няма каму вынесці — адны старыя. У вёсцы маіх бацькоў, у Мінскай вобласці, чалавек 10—15 толькі жыве. Чым дрэнна, што райцэнтр можа прапанаваць машыну і каманду, якая тую магілу выкапае?

Наведвальнікі інтэрнэтфорумаў ужо жартавалі: «Няўжо жыхары Лошыцы збіраюцца жыць вечна?» Смерць, на жаль, — з'ява непазбежная. Па статыстыцы, штодзень у Мінску памірае ў сярэднім 55 чалавек. За мінулы месяц толькі на Альшэўскага работнікі спецкамбіната прынялі 142 заяўкі. Зразумела, у некаторых раёнах сталіцы жыве шмат моладзі, якой пакуль рана клапаціцца пра гэта. Ніхто не хоча бачыць побач з домам чужое гора. Аднак буйны горад, дзе працуюць пэўныя стандарты развіцця інфраструктуры, диктуе свае ўмовы, пад якія трэба ўмець падладзіцца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12, 13, 14 по генплану в районе пересечения улиц Проектируемой № 1, Проектируемой № 2 в границах жилого района «Лебяжий». Дом № 14 без инженерных сетей»

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566.

**Юридический адрес**: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3, Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет КУП «УКС Центрального района г. Минска» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 20 по ул. Камайская;
- жилой дом № 12 по ул. Камайская;
- жилой дом № 15 по ул. Ратомская;
- жилой дом № 16 по ул. Мястровская.

Цель проекта – строительство жилого дома № 14 по генплану в составе объекта «Многоквартирные жилые дома по г/п №№ 11, 12, 13, 14 в районе пересечения улиц Проектируемой № 1, Проектируемой № 2 в границах жилого района «Лебяжий»» общей площадью 12,3 тыс.кв.м, в том числе общая площадь квартир – 10,4 тыс.кв.м.

**Вид строительства:** новое строительство.

**Начало строительства** – III квартал 2014 года.

**Окончание строительства** – II квартал 2016 года.

**Проектные решения:** Жилой дом запроектирован 9-этажным 4-секционным, всего квартир – 162, в том числе однокомнатных – 36 шт., двухкомнатных – 72 шт., трехкомнатных – 54 шт. Секции оборудованы лифтами на 630 кг со скоростью 1,0 м/с, и мусоропроводом. В техническом подполье запроектированы помещения для инженерного обслуживания дома – помещение ИТП и электрощитовая. Входы в техподполье выполнены непосредственно снаружи. При входных группах в каждую секцию предусмотрено место для пандуса. Конструкция здания – монолитный каркас со стенами с плоскими монолитными перекрытиями. В квартирах, расположенных на 6-м этаже и выше, предусмотрено устройство вторых эвакуационных выходов на лоджию с глухим простенком от торца лоджии и балкона до оконного проема не менее 1,2 м. Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками; облицовка конструкций приямков и крылец плитами искусственного камня. Окна – деревянные по СТБ 939-93 с одинарным остеклением (двухкамерный стеклопакет). Витражи остекления лоджий – из профилей ПВХ. Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.06.2010 № 671-15/10. Участок площадью 0,7073 га передан КУП «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома от 13.03.2014 № 591(1) (до 1 августа 2015 года). Получено разрешение на организацию стройплощадки Госстройнадзора от 08.09.2014 № 2-209Ж-031/14. Получено разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство работ от 26.09.2014 №2-209Ж-031/14.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 7,8% общей площади жилого дома.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства **для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся** в улучшении жилищных условий, предлагаются:

10 (десять) однокомнатных квартир;
10 (десять) двухкомнатных квартир;
10 (десять) трехкомнатных квартир.

Стоимость 1 $м^2$ жилья для однокомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 616 145 (шестнадцать миллионов шестьсот шестнадцать тысяч сто сорок пять) белорусских рублей;

16 054 029 (шестнадцать миллионов пятьдесят четыре тысячи двадцать девять) белорусских рублей при единовременной оплате.

Стоимость 1 $м^2$ жилья для двухкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

16 054 029 (шестнадцать миллионов пятьдесят четыре тысячи двадцать девять) белорусских рублей;

15 491 913 (пятнадцать миллионов четыреста девяносто одна тысяча девятьсот тринадцать) белорусских рублей при единовременной оплате.

Стоимость 1 $м^2$ жилья для трехкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации:

15 491 913 (пятнадцать миллионов четыреста девяносто одна тысяча девятьсот тринадцать) белорусских рублей;

14 929 797 (четырнадцать миллионов девятьсот двадцать девять тысяч семьсот девяносто семь) белорусских рублей при единовременной оплате.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере **15% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) банковских дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается до окончания строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору, либо единовременно (для квартир по коммерческой цене).

Оплата производится в белорусских рублях на специальный и расчетный счета застройщика.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве:**

Для подачи заявления необходимы: паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Прием заявлений осуществляется с 18.12.2014 г. и до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, перерыв (понедельник – пятница) с 13.00 до 13.45.

Тел. 306-07-26.

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот № 1.** Капитальное строение – одноэтажное панельное здание склада, инв. № 252/С-2625, общей площадью 170,1 м.кв., стоимостью 39 396 000 бел. рублей.<br>**Лот № 2.** Капитальное строение – одноэтажное панельное здание пилорамы, с инв. № 252/С-2624, общей площадью 234,9 м.кв., стоимостью 58 140 000 бел. рублей.<br>**Лот № 3.** Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание конторы СМУ, с инв. № 252/С-2606, общей площадью 60,7 м.кв., стоимостью 21 732 000 бел. рублей.<br>**Лот № 4.** Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание РБУ СМУ, с инв. № 252/С-2602, общей площадью 309,9 м.кв., стоимостью 93 122 000 бел. рублей.<br>**Лот № 5.** Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание склада, с инв. № 252/С-2595, общей площадью 321,8 м.кв., стоимостью 69 569 000 бел. рублей.<br>**Лот № 6.** Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание склада, с инв. № 252/С-2611, общей площадью 108,3 м.кв., стоимостью 33 237 000 бел. рублей.<br>**Лот № 7.** Капитальное строение – одноэтажное кирпичное здание склада, с инв. № 252/С-2593, общей площадью 123,6 м.кв., стоимостью 32 079 000 бел. рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | ООО ПКФ «Натэк» (УНП 390184654) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Новополоцк, г.п. Боровуха, база ООО НКФ «Натэк» |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «БПС-Сбербанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 30.12.2014 в 11.00 г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 320 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, 210029, г. Витебск, ул. Правды, д. 34. Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс (80212) 607106, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212)600975 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 11.00 29.12.2014 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |



**Яўген ПЕРЛІН:**

# «Важна быць першым... Нават у памылках»

## Тэлевядучы лічыць, што і перамогі, і няўдачы трэба прымаць з годнасцю

**Ён з ліку тых маладых людзей, хто заўсёды ведае, на які вынік разлічваць, і не шкадуе ні часу, ні сіл, каб дамагчыся жаданага. Сваю настойлівасць на шляху да мэты Яўген нават залічвае да ўласных недахопаў, але, як бы там ні было, а вынік відавочны. З 17 гадоў ён працуе ў прамым эфіры: спачатку на радыё «Юністар», а потым у кадры, на тэлеканале «Беларусь 1». Сёння яго можна ўбачыць у ранішніх эфірах навін, па чацвяргах у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!». А падчас правядзення песеннага конкурсу «Еўрабачанне» яго каментатар Яўген Перлін робіцца ці не самай медыйнай персонай. Аднак сам тэлевядучы славутасцю сябе не лічыць і саромеецца, калі ў яго просяць аўтограф... На каго ён арыентуецца ў прафесіі, што лічыць недапушчальным, каб не страціць давер гледачоў, і ў чым бачыць галоўную «фішку» перамогі на «Еўрабачанні», мы распыталі пры сустрэчы.**

***— З таго, што пішуць пра вас, галоўную выснову можна зрабіць такую: вы малады, але ўжо дасягнулі пэўнага поспеху ў сваёй сферы. Ці згодны з такім меркаваннем?***

— Усё адносна. Адчуваць сябе паспяховым — значыць быць усім задаволеным. А калі гэта адбываецца, ты спыняешся ў сваім руху. Я пакуль не адчуваю, што ўсё добра. Так, я займаю некаторыя пасады, якія для маладых журналістаў сведчаць пра паспяховасць, але, працуючы на пэўным узроўні, ты адчуваеш жаданне дасягнуць большага. Шукаеш магчымасці рэалізоўваць сябе. На мой погляд, вядучы на першым канале — гэта вяршыня журналісцкай кар'еры сярод вядучых; ацэньваючы ў такім ракурсе, я дасягнуў поспеху. Потым можна расці ўжо да адміністрацыйнай пасады, але офісная работа мяне сёння не цікавіць, і я не імкнуся да гэтага.

***— У дзяцінстве ў вас былі розныя мары адносна таго, кім стаць. І адна з іх — «быць Уладам Лісцьевым»... Гэта быў першы кумір у прафесіі?***

— Нават не тое, каб гэты чалавек быў кумірам. Проста я бачыў яго на экране, і мне хацелася быць на яго месцы. Умець, як ён, прыгожа размаўляць і «раскручваць» суразмоўцаў. Яго энергетыку, калі глядзеў тую ж праграму «Час пік», адчуваў праз экран тэлевізара. Такое вось было дзіцячае ўяўленне, прычым не было мары «стаць добрым журналістам» альбо «тэлевядучым», а хацеў быць менавіта ім, Уладам Лісцьевым.

> **«Мне не прыходзіцца сябе неяк кантраляваць, падстройвацца ці абмяжоўваць, таму што я не паводжу сябе непрыстойна, каб потым саромецца».**

***— А сёння ёсць людзі ў сферы ТБ, каго, на ваш погляд, можна лічыць узорам прафесіяналізму?***

— Безумоўна, ёсць. Я арыентуюся на сучасных прафесіяналаў. Для сябе вылучаю, напрыклад, Уладзіміра Познера. Гэты чалавек мне імпануе як вядучы, які мае свае незалежныя погляды па многіх тэмах. Я стараюся адсочваць яго лініі пабудовы інтэрв'ю і назапашваю цікавыя прыёмы для ўласнай працы.

***— Мадэлі вядзення праграм у стылі Опры Уінфры ці Лары Кінга вам не блізкія?***

— Яны таленавітыя і прафесіяналы, але пакуль я працую на рускамоўную аўдыторыю, то павінен улічваць, што ў нашых людзей зусім іншы менталітэт. І іх прыёмы з нашым народам проста не спрацуюць. Тое ж самае, калі казаць пра гумар. У нас Іван Ургант — гэта смешна і весела, а ў Амерыцы яго, магчыма, не да канца зразумелі б. Такая розніца ў прыёмах працы і падыходах да аўдыторыі і адрознівае нашы і амерыканскія шоу.

***— Вядучаму, каб яго праграмы глядзелі, трэба заваяваць давер гледача. Як гэтага дасягнуць?***

— Трэба быць шчырым. Гэтае правіла дапамагае мне як у жыцці, так і на працы. Я не дапускаю падману гледача, якой бы інфармацыі гэта пакіпць з цябе. Мне не прыходзіцца сябе неяк кантраляваць, падстройвацца ці абмяжоўваць, таму што я не паводжу сябе непрыстойна, каб потым саромецца. Я даволі адкрыты ў тых жа сацыяльных сетках, дзе выкладваю самыя яскравыя падзеі свайго жыцця. І людзі, якія знаёмы са мной, ведаюць, што розніца паміж мной у жыцці і на экране толькі ў тым, што падчас працы ў мяне больш сур'ёзны вобраз і стрыманыя паводзіны.

***— У вас ёсць вопыт вядзення прамых эфіраў на радыё і на тэлебачанні. Навучыліся ўжо спраўляцца з хваляваннем?***

— Прывыкаеш да прамых эфіраў недзе праз год працы. Дзевяноста адсоткаў людзей, якія трапляюць туды, становяцца залежнымі ад гэтага



ні датычылася. Напрыклад, калі мы маем справу з лічбамі, то я буду да апошняга моманту перад эфірам адсочваць, як змяняюцца паказчыкі. І ў выпуску я павінен апошнія лічбы агучыць, бо глядач можа зайсці ў інтэрнэт і праверыць маю інфармацыю. У інфармацыйным грамадстве вельмі лёгка быць злоўленым на хлусні. У Беларусі наогул не вельмі любяць сваё і сваіх, таму, каб мець павагу, трэба добра і сумленна выконваць сваю працу.

***— Паводзіны вядучага па-за студыяй таксама ўплываюць на давер?***

— У нас маленькая краіна. І калі ты знаёмы і сустракаешся з вялікай колькасцю людзей, то знаходзішся ўвесь час у полі зроку. Тваё асабістае жыццё, у тым ліку і адлюстраванае ў сацыяльных сетках, таксама даступнае для старонніх вачэй. Заўсёды знойдуцца нядобразычліўцы, якія будуць рады скарыстацца магчымасцю драйву. І калі сыходзіш на іншую працу, то адчуванняў прамых эфіраў не хапае, пачынаецца ломка. А наконт хвалявання магу сказаць, што самае галоўнае — умець сабрацца ў патрэбны момант. Памятаю, калі быў першы эфір на радыё, то падчас праграма ўключэння з прэс-канферэнцыі не хваляваўся, а потым адчуў, што гэта такое. Хацелася даведацца, як усё прайшло. У працу наогул уключаешся на аўтамаце. Што б ні адбывалася навокал, ты засяроджваешся на справе. Калі скончыцца выпуск, то ўжо пачынаеш рэагаваць на падзеі і людзей, якія побач. Я не магу сказаць, быццам з часам прыйшоў да такой пазіцыі, бо пасля першага эфіру зразумеў: павінна быць так і не інакш.

***— Часта аналізуеце тое, як выглядаеце на экране?***

— Гляджу, калі ёсць для гэтага час. Асабліва калі быў у эфіры з новым гальштукам альбо ў новым касцюме. Тады трэба паглядзець, як тое ж свята выстаўляюць, і прааналізаваць карцінку. Што тычыцца падачы навін, то таксама сачу за тым, з якой мімікай і жэстамі ўсё раблю ў кадры.

> **«У нас маленькая краіна. І калі ты знаёмы і сустракаешся з вялікай колькасцю людзей, то знаходзішся ўвесь час у полі зроку».**

***— Цяпер вас можна ўбачыць не толькі ў «Навінах», але і ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!». Ці новы гэта вопыт для вас?***

— Такая праца мне не ў навінку, таму што я працую ў забаўляльным жанры як вядучы на розных мерапрыемствах. Для сябе я не бачу ніякай розніцы паміж забаўляльным эфірам і вядзеннем, напрыклад, вяселляў, карпаратываў. Ты імправізуеш, падымаеш людзям настрой... На тэлебачанні адрозненне хіба толькі ў тым, што трэба памятаць пра рубрыкі, размовы з гасцямі і выхады навін.

***— Працу на карпаратывах некаторыя лічаць ганебнай для рэпутацыі тэлевядучага, аднак зразумела, што гэта дае заробак...***

— Усе вядучыя розныя. Нават на захадзе яны вядуць канцэрты, вяселлі і іншыя мерапрыемствы. І я не казаў бы, што гэта толькі добры заробак, таму што мне такая праца дае найперш магчымасць разнявольвацца, падзяліцца эмоцыямі. І для мяне ў гэтым самае важнае.

***— Як вам працуецца ў пары з Вольгай Рыжыкавай?***

— Мы з Вольгай вучыліся ў адной школе. Калі я прыйшоў на тэлебачанне, то ў нас складыся добрыя адносіны. Даведаўшыся пра работу ў пары, нам не давялося падладжвацца неяк, і ў кіраўніцтва не было пытанняў, ці будзем мы глядзецца ў тандэме. Мы інтуітыўна разумеем, калі трэба дапамагчы, падхапіць і весці ў патрэбным кірунку.

***— З чаго пачынаецца ваша раніца?***

— З навін і прагляду сацыяльных сетак. Таксама мне раніцай патрэбен кубачак кавы.

***— Вось ужо два гады вы каментуеце конкурс «Еўрабачанне». Напярэдадні фіналу нацыянальнага адбору ці ёсць нейкія асабістыя прагнозы, хто ж будзе прадстаўляць краіну ў наступным годзе?***

— Я прагнозаў не раблю, таму што гляджу і ўспрымаю ўсё з пазіцыі чалавека, які працуе ў камандзе. І хтосьці можа інтэрпрэтаваць мае ацэнкі так, быццам я ўплываю на выбар журы таго ці іншага ўдзельніка. Хаця бывалі выпадкі, калі інтуітыўна ўдавалася ўгадваць пераможцаў. Я цяпер праз тыя ж сацыяльныя сеткі імкнуся данесці думку, што мы робім з гэтага конкурсу вельмі значную падзею. Трэба прасцей на ўсё глядзець. У прынцыпе, «Еўрабачанне» — гэта конкурс для маладых выканаўцаў, а мы ўспрымаем яго, нібы «Оскар», дзе вызначаюць лепшага сярод прызнаных...

***— Але ж і самі выканаўцы часам ставяцца да «Еўрабачання» як да пэўнай кар'ернай вышыні...***

— Магчыма, пэўная вышыня на пачатковым этапе... Бо можна перамагчы на конкурсе, а потым цябе забудуць, калі не скарыстаешся момантам і не будзеш развівацца. У нас, магчыма, пэўную ролю яшчэ і патрыятызм адыгрывае, бо прывезці конкурс у Беларусь прэстыжна. І ўся «фішка» для беларускіх артыстаў толькі ў тым, каму ўдасца зрабіць гэта першым. Яго будуць памятаць.

***— Ці важна вам быць у жыцці першым?***

— Так, безумоўна, важна, і ва ўсім. Нават у памылках. Я не баюся гэтага. Я лёгка прымаю свае паражэнні, таму што разумею, што не заўсёды ўсё бывае гладка, але трэба разлічваць на поспех.

***— У студзені вам спаўняецца 25. Якія мэты цяпер у жыцці?***

— Ведаеце, у мяне няма такога, каб мэты былі распісаны па гадах. Кажуць, гэта не вельмі добра, але для мяне такі падыход больш рэальны, бо я хачу ўсяго і адразу. Разумею, што да здзяйснення жадання трэба дайсці, а між тым не ўсё ад мяне залежыць... Хацеў машыну — адвучыўся ў аўташколе і зарабіў на аўтамабіль. Так і строю планы па меры неабходнасці. Пакуль што аддаю сябе таму, што маю.

**Алена ДРАПКО.**


# СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ!

Падчас правядзення чарговай рэкламнай гульні «Звязда» разыграе сярод падпісчыкаў **лічбавыя тэлевізійныя рэсіверы** і суперпрыз — **тэлевізар LG з дыяганаллю 99 см.**

Што трэба для таго, каб выйграць? Як заўсёды — падпісацца на газету на 1-ы квартал альбо 1-е паўгоддзе і, запоўніўшы картку ўдзельніка гульні, даслаць яе ў рэдакцыю (падрабязная інфармацыя аб правілах — у нумары за 26 лістапада).



**Для тых, хто ўжо вырашыў жыць са «Звяздой», але на новы год пакуль не падпісаўся, — маленькая падказка: зрабіце гэта цяпер, бо якраз з _1 па 15 снежня_ ўсім індывідуальным падпісчыкам прапаноўваюцца зніжкі: кошт падпіскі на месяц будзе складаць 56 150 беларускіх рублёў.**



**Зніжкі — і ў гэты ж час — прапаноўваюцца і на іншыя выданні Выдавецкага дома «Звязда»: на газету «Літаратура і мастацтва», часопісы «Алеся», «Бярозка», «Вожык», «Маладосць», «Нёман», «Полымя», «Родная прырода».**

***Заставайцеся са «Звяздой»!***

**3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2015 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
**(аддзяленне сувязі)**

____________________ **на I кв. або 1–е паўг. 2015 года**

**Хатні адрас і тэлефон** **(абавязкова)** [ ] **(індэкс)** ____________________

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

## наступны тыдзень

**ШАЛІ.** У пачатку тыдня вельмі ўважліва пастаўцеся да ўсёй інфармацыі, якая будзе да вас паступаць. Магчымыя непаразуменні з калегамі і блізкім акружэннем. Калі зможаце не дапусціць крайнасцяў у сітуацыі, то вельмі хутка ўсё наладзіцца, і вы забудзецеся пра гэтыя дробныя непрыемнасці. Другая палова тыдня прадвяшчае паляпшэнне матэрыяльнага становішча і наладжванне сітуацыі дома. Вельмі важна зразумець, як жа складваюцца справы з працай. Быццам бы ў перспектыве ўсе нядрэнна, але канкрэтных адказаў і заданняў вам ніхто так і не дае. Трэба праявіць ініцыятыву і высветліць, што ж чакае наперадзе.

**СКАРПІЁН.** Варта глыбей унікнуць у сутнасць рэчаў, заняцца асэнсаваннем той сітуацыі, у якой знаходзіцеся. Пакуль вы не спыніцеся і не раскладзяце ўсё па паліцах, не разберацеся, што да чаго,— лепш не рухацца далей. Атрымаецца сур'ёзна прасунуцца ў рэалізацыі сваёй мары, асабліва калі гэта неяк звязана з канкрэтнымі аб'ектамі матэрыяльнага свету або грашыма. Адносіны ў сям'і поўныя любові і клопату. Зоркі абяцаюць прыўзняты настрой і пазітыўны погляд на жыццё. Канец тыдня чымсьці здзівіць, але навіны будуць прыемныя.

**СТРАЛЕЦ.** Стральцам відавочна не хапае новых уражанняў, пачатак зімы вас чамусьці не радуе. Можаце сустрэць сваю другую палавінку або наладзіць цяперашнія адносіны. Прычым развіццё ў асабістым жыцці будзе адбывацца досыць імкліва, адносіны могуць хутка перайсці на новы ўзровень, і паміж вамі з'явіцца ўжо не толькі рамантычная прыхільнасць, але і больш цесная ўзаемасувязь, сумесныя справы і планы, што ў значнай ступені ўмацуе адносіны. Нядрэнны тыдзень і для кар'ерных, рабочых пытанняў, тут вы можаце праявіць сябе з лепшага боку і дасягнуць пэўнага поспеху. Не варта толькі гаварыць лішняга і выклікаць зайздрасць накалёных.

**КАЗЯРОГ.** Варта зменшыць абароты ў сваёй дзейнасці і трошкі знізіць планку жаданняў. Залішняя самаўпэўненасць можа толькі нашкодзіць. Ад вас патрабуецца спакойная размераная праца, дакладнае выкананне плана і, самае галоўнае,— якасць у выкананні ўсяго, што патрабуецца. Толькі ў такім выпадку вы можаце разлічваць на вынік. Калі ж праявіце няўважлівасць, паспешлівасць, то ўсе справы могуць пайсці зусім не так, як вы планавалі. Калі на працы вас просяць затрымлівацца звышурочна, варта згадзіцца, хоць, вядома, да суботы вы будзеце адчуваць сябе зусім стомленымі. Напрыканцы тыдня чакайце добрай кампаніі і сустрэчы з сябрамі.

**ВАДАЛЕЙ.** Вельмі актыўны і плённы тыдзень. Вы адчуеце ў сабе новы прыліў сіл, новыя магчымасці і зможаце актыўна прасунуцца наперад у любых пытаннях (асабліва актуальныя пытанні кар'еры і адносін). Але ў самым пачатку варта вызначыцца і зрабіць выбар, па якім шляху пайсці, інакш можаце змарнаваць шмат часу, застаючыся ў нерашучасці або спрабуючы паспець і тут, і там. Невялікае процібортсва з вонкавага боку вы можаце адчуць у канцы тыдня — не спыняйцеся перад перашкодамі. Знайдзіце, чым сябе можна парадаваць.

**РЫБЫ.** Вельмі пераменлівы тыдзень. У нейкія дні вам будзе спадарожнічаць поспех і ўсё будзе вырашацца само сабой, у іншыя вы будзе сутыкаць вас: за што б ні ўзяліся, будзе валіцца з рук. Сакрэт поспеху (або выжывання) заключаецца ў тым, што трэба адпусціць сітуацыю, ні на чым не канцэнтравацца, не строіць планаў і жыць так, як атрымліваецца. У такім выпадку зможаце атрымаць максімальную выгаду з усёй гэтай зменлівай сітуацыі і абысці ўсе вострыя вуглы з мінімальнымі выдаткамі для сябе. Пятніца падыходзіць для тых Рыб, у якіх пакуль не ўладкавана асабістае жыццё. Імкніцеся да знаёмстваў, і яны абавязкова адбудуцца!

## ЧАЦВЕР, 18 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.25** Зона Х.
**9.10, 21.45 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Меладрама «Шчаслівчык Пашка».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «На шляху да сэрца». 1-я серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.30 Серыял «Сваты 4».**
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20, 0.40** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**23.45** Вечар цяжкага дня.
**1.20** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.35** Тэлебарометр.
**9.05, 15.10 Серыял «Сашка».**
**10.10** Беларуская кухня.
**10.45, 22.55 Серыял «Віртуозы».**
**11.55** Ток-шоу «Перазагрузка».
**12.40** Кіпень.
**13.00, 18.50 Серыял «Універ».**
**14.10, 19.55 Камедыя «Сяброўства народаў».**
**16.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Спрынт. Жанчыны.
**17.50, 0.05 Серыял «Таксі».**
**20.55** Цела чалавека.
**21.25** Спортлато 6 з 49.
**21.30** КЕНО.
**21.40, 0.35 Трылер «Прывіды».**
**0.00** Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.45** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.15, 19.25, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.15 «У жніўні 44-га...». Драма.**
**10.10, 17.55** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**10.35 «БаБу». Драма.**
**11.55** «Мой бацька — Юрый Цвяткоў». Дак. фільм.
**12.50, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава.
**13.30** «Дождж». Дак. фільм.
**13.40** Ж. Бізэ. «Кармэн». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.
**16.20** «Наперад у мінулае».
**16.50 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Драма. 2-я серыя.**
**18.20** «Дудар». Дак. фільм.
**18.30** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.00** «Сіла веры».
**19.40, 21.10, 22.45 «Трэст, які лопнуў». Камедыя.**
**20.45** Калыханка.
**22.15** «Дыя@блог». «Пра вечнае».

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 0.05** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Эстафета. Мужчыны.
**9.35** Валейбол. Кубак выклікy. 1/16 фіналу. «Будаўнік» (Мінск) — «Ціікерыт» (Фінляндыя).
**11.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Хохфільцэн. Эстафета. Жанчыны.
**13.15** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Салават Юлаеў» (Уфа).
**15.05** Баскетбол. Еўрачэлендж. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Енісей» (Расія).
**16.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Атлетык» (Іспанія) — БАТЭ (Беларусь).
**18.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Фіярэнціна» (Італія) — «Дынама» (Мінск, Беларусь).
**19.55** Гандбол. SEHA-ліга. «Татран» (Славакія) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**21.40** Авертайм.
**22.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Жанчыны.
**23.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Жыхары акіянаў».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «ЗАГС».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Спакуса».**
**23.20** Канцэрт «Сімфанічнае «Кіно».
**0.40** «Вячэрні Ургант».
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Прыгоды дылетанта».
**9.40** «Гарачы лёд».
**10.05** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50 Маст. фільм «Галоўнае — не баяцца!».**
**15.45** «Татальны распродаж».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Мужчынскія ісціны»: «Усе бабы дурніцы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Лязо ведзьмаў».**
**22.10** «Глядзець усім!».
**23.00** «Тайны свету».
**0.00** «Аўтапанарама».
**0.20 Серыял «Энігма».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Дыяспары».
**9.10 Маст. фільм «Шчаслівая, Жэнька!».**
**10.30 Маст. фільм «Спартакіяда. Лакальнае пацяпленне».**
**11.55, 16.00, 19.00, 0.30** Навіны (бягучы радок).
**12.00** Прэс-канферэнцыя Прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна.
**15.05, 2.25 Серыял «Іншы свет».**
**15.30, 2.55 Серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».**
**16.20, 23.40** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.10 Серыял «Развітальнае рэха».**
**19.20, 3.25 Серыял «Метад Лаўровай».**
**22.00 Маст. фільм «Французэ».**
**0.40 Серыял «У кожнага свая вайна».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Тамаграма лёсу. Звіліны таленту».
**11.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**13.00** Прэс-канферэнцыя Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна.
**16.00** «Мая планета».
**16.50, 19.50, 23.35** Навіны — Беларусь.
**17.15** «Шыфры нашага цела. Сэрца».
**18.05 Маст. фільм «Сяброўкі».**
**20.50 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.50, 23.45 Серыял «Тайны следства».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.20** «Пракурорская праверка».
**9.30, 10.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.30** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.40** «Справа густу».
**15.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.40, 16.35 Серыял «Ляснік».**
**17.55** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**20.00 Серыял «Браткі».**
**22.55** Анатомія дня.
**23.50 Серыял «Чалавек ніадкуль».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.15, 19.05, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30 Серыял «Лялечны дом».**
**9.15, 17.50** «Навіны».
**9.25 Серыял «Айцец Браўн».**
**10.30** «TUT BY прадстаўляе». «Артэфакт».
**11.00 Трылер «Саветнік».**
**13.05** «Кінаблакнот».
**13.20 Серыял «Чарцяня».**
**15.15** «Тэлемагазін».
**16.30** «Золата маўчання».
**16.55 Серыял «Эўрыка».**
**18.00 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».**
**18.50** «Фэшн is my прафэшн».
**19.10 Серыял «Рака».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Таямнічы Альберт Нобс».**
**23.20 Серыял «Прыгарад».**

### ВТБ

**6.00, 5.50** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.05, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.30** Серыял «Варонiны».
**9.30, 13.30, 19.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**10.00, 20.00** Серыял «Кухня 4».
**11.00** «Празорлівая».
**12.00** Серыял «Аманда О».
**13.00** Серыял «Супер Макс».
**14.00** «Знаёмцеся, мужчына!».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Камедыя «Дзікая штучка».
**18.30** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Парыж любой цаной».
**23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 5.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Баявік «На скейце ад смерці».
**2.30** Трылер «Разумнае сумненне».
**4.10** «Кіно ў дэталях».
**5.20** «Спатканне з густам».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.15** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Нагляднік».
**11.15, 23.35** Маст. фільм «Без Сонца».
**13.05, 22.45** Дак. серыял «Апосталы». «Матфей, Матфій, Іуда».
**13.35** Маст. фільм «Адкрытая кніга». Фільм другі. 4-я серыя, заключная.
**14.40, 17.20** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.10** Academia. Яўген Штэйнер. «Манга Хакусая» — энцыклапедыя японскага жыцця ў малюнках». 2-я лекцыя.
**16.00** «Абсалютны слых».
**16.40** Дак. фільм «Барыс Анрэп. Мазаіка лёсу».
**17.35** «Снежанскія вечары. Выбранае». Святаслаў Рыхтэр.
**18.20** Дак. фільм «Вітус Берынг».
**18.30** «Тыя, з якімі я... Міця Крупко».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.10** Адваротны бок Месяца. Дак. фільм «Уільям Томсан. Абсалютная велічыня».
**20.50** «Добрай ночы, малышы!».
**21.05** «Правілы жыцця».
**21.30** Дак. серыял «Адлюстраваны час».
**22.00** «Культурная рэвалюцыя».
**1.20** С. Пракоф'еў. Сімфонія № 2. Дырыжор Валерый Гергіеў.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока. Група «Дзіўныя гульні». 1-я частка.
**7.00** Фільм-канцэрт «Лірычныя песні Мікаэла Тарыверdзіева». 1977 год.
**7.20, 13.35** Спектакль тэатра «Сучаснік» «Хто баіцца Вірджынію Вульф?». 1992 год.
**8.40, 1.15** Канцэрт замежнай эстрады.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Песня-91».
**12.00, 18.00** Дак. фільм «Хто дыктуе моду?». 1986 год.
**12.40** Фільм-канцэрт «Аповед аб некалькіх днях». Гастролі Рыкарда Фолі ў Маскве. 1985 год.
**18.40** Фільм-канцэрт «Рытмы эстрады». 1984 год.
**19.10** Тэлеспектакль «Гульцы». Камедыя М. Гогаля. 1978 год.
**0.00** «...Да 16 і старэйшым». «Падумаем разам». 1989 год.
**1.00** М/ф «Хто прыйдзе на Новы год?».
**1.40** «Гэты фантастычны свет». Тэлеспектакль «Выпадак з палкоўнікам Дарвінам». 1985 год.

### EUROSPORT

**10.35, 18.15** Снукер. Еўрапейскі тур. Фінал.
**11.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**12.45** Фігурнае катанне. Гран-пры. Фінальны Гран-пры.
**14.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Хуткасны спуск. Мужчыны. Трэніроўка.
**15.30** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу.
**16.15, 20.00, 1.15** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**17.30, 21.00, 2.45** WATTS.
**21.30, 2.15** All Sports.
**22.00** Байцоўскі клуб.
**0.00** Конны спорт. Коннае скачковае шоу (канкур).

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 14.30, 3.10** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**6.50** Фэнтэзі «Прывід з шафёрам».
**8.10, 17.10, 0.50** Скетчком «Паміж намі».
**8.25** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**10.50** Камедыя «Рымскія прыгоды».
**12.45** Прыгоды «Фантамас разбушаваўся».
**14.50, 17.30, 22.00** Серыял «Дванаццаць дванаццаць».
**15.35** Камедыя «Сведка на вяселлі».
**18.30** Камедыя «Два ў адным».
**20.20** Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».
**23.10** Камедыя «Кур'ер».
**1.15** Камедыя «Эмігрант».
**4.00** Камедыя «Прынц і танцоўшчыца».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.20, 14.15** «Доктар І.».
**7.50, 18.50, 2.15** Серыял «Каханне і пакаранне».
**9.30, 4.25** Дак. серыял «Па справах непаўналетніх».
**11.20, 17.50** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.20, 16.50** «Шчырая размова».
**13.20** Серыял «Аўрора».
**14.50, 0.40** Серыял «Каменская».
**15.45, 22.50, 3.40** «Зорныя гісторыі».
**20.45** Серыял «Двайное жыццё».
**21.50, 1.25** Серыял «Справа Гастранома № 1». Заключная серыя.
**23.50** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.30** Меладрама «Сямейка Джонсаў».
**8.30** Драма «Легенды восені».
**11.05, 18.10** Камедыя «Я нармальна супер гуд».
**12.55** Камедыя «Парыж—Манхэтэн».
**14.25** Трагікамедыя «Гуманітарная навукі».
**16.10** Баявік «Напруж звіліны».
**20.00** Камедыя «1+1».
**22.05** Драма «Сірыяна».
**0.20** Трылер «Добры доктар».
**2.00** Трылер «Пакой страху».
**4.00** Меладрама «Палюбоўнікі».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Трагікамедыя «Баламут».
**7.55** Камедыя «Тры дзяўчыны».
**9.30** Фільм-казка «Агонь, вада і... медныя трубы».
**11.00** Фэнтэзі «Рыжык у Задюстаркоўі».
**13.10, 4.45** Драма «Пісьмы мёртвага чалавека».
**14.50** Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
**17.00** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**18.30** Драма «Старэйшая жонка».
**20.20** Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
**22.10** Камедыя «Ёлкі 3».
**23.55** Камедыя «З Новым годам, мамы!».
**1.30** Драма «Райскія птушкі».
**3.15** Меладрама «Прагулка».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**7.00** Гульні розуму.
**8.00** Займальная навука.
**9.00, 14.00, 20.00** Звярыны патруль.
**10.00, 15.00** Шаша праз пекла.
**11.00** Аўтарэстаўратары.
**12.00** Мегазаводы.
**13.00, 19.00** Скарбашукальнікі.
**16.00** Сіла племя.
**17.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**18.00, 3.00** Паветраныя асы вайны.
**21.00, 1.00, 4.00** Разбагацей або памры на капальні.
**22.00, 2.00, 5.00** Золата Юкана.
**23.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**0.00** У пагоні за НЛА.

### DISCOVERY

**8.00, 10.35** Залатая ліхаманка.
**8.50** Курс экстрэмальнага кіравання.
**9.40, 14.15, 21.35** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.40, 21.05, 5.45** Як гэта зроблена?
**11.30, 6.10** Як уладкаваны Сусвет.
**12.25, 17.25** Багажныя войны.
**13.20, 1.55** Top Gear.
**15.10, 4.55** Поўны фарсаж.
**16.05, 7.05** Вялікі махінатар.
**17.00** Махінатары.
**18.20** Паляўнічыя на рэліквіі.
**19.15** Дарога да прыбытку.
**20.10** Склады: бітва ў Канадзе.
**22.00** Дамы на дрэвах.
**23.00** Каралі сталярнай справы.
**0.00** Стальныя мышцы.
**1.00, 4.05** Прапажы на продаж.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.

## СУБОТА, 20 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.45** Існасць.
**7.10 Меладрама «Палюбоўнікі».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50, 0.15 Серыял «Цуд».**
**10.50** «Пра ежу!».
**11.25** Кулінарная дыпламатыя.
**12.10** Гісторыі рамонту.
**12.45** Ток-шоу «Здароўе».
**13.25** БеларусьLIFE.
**13.50** «Зорнае жыццё». «Апантаныя працай».
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30, 1.25** «Вялікая розніца».
**17.20 Меладрама «Пацалунак лёсу». 1-я і 2-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40 Драма «У Парыж!».**
**1.15** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.40 Маст. фільм «Ледзяная ўнучка».**
**7.55** Толькі для дарослых.
**8.15** М/с «Аватар: Легенда пра Аанге».
**9.10** Беларуская кухня.
**9.50, 21.15** Тэлебарометр.
**9.55, 21.20 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**11.30** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка пераследу. Жанчыны.
**14.05** Капейка ў капейку.
**14.45** Вось гэта дзіва!
**15.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Гонка пераследу. Мужчыны.
**16.20** «Comedy Батл». Без мяжы».
**17.25** «Comedy woman».
**18.30** Ікра.
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** «Сустрэча з ...» Уладзімір Цэслер.
**20.40** Кіпень.
**21.00** Спортлато 6 з 49.
**21.05** КЕНО.
**23.00 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.20, 14.45, 23.45** «Калейдаскоп».
**8.15** «Набліжэнне». Сацыяльная прытча.
**9.40** «Камертон». Міхаіл Пятроўскі.
**10.05** «Адступнік. Валерый Рубінчык». Дак. фільм.
**10.25 «Вянок санетаў». Драма.**
**11.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.30 «Падарожжа мсье Перышона». Камедыя.**
**13.45 «Пані Мяцеліца». Фільм-казка.**
**14.55** «Музеі Беларусі». Музей гісторыі Мінска.
**15.20** «Без эпітафіі». Дак. фільм.
**16.10 «Вінт». Кароткаметражны фільм.**
**16.30** Шлягеры на ўсе часы. «Джаз і класіка». Канцэрт Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.
**17.45** «Дыя@блог P.S.».
**18.15 Серыял «Робін з Шэрвуда». Заключныя серыі.**
**20.45** Калыханка.
**21.10 «Рыцар без даспехаў». Драма.**
**22.55** «Афганістан. Я памятаю». Дак. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.35** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Фактар сілы.
**8.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Мужчыны.
**10.10** Піт-стоп.
**10.40** Хакей. Ароса Чэлендж. Славакія — Беларусь.
**12.35** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**13.10** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Барыс» («Астана»).
**15.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**15.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Крыстал Пэлас».
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**20.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгемптан» — «Эвертан».
**22.00** Хакей. Ароса Чэлендж.
**23.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка пераследу. Мужчыны.
**0.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка пераследу. Жанчыны.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.10** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** «Ералаш».
**13.15** «Валянціна Талкунова. «Ты за каханне прабач мяне...».
**14.15** «У наш час».
**15.10** «Рассмяшы коміка».
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Вялікія гонкі». Фінал.
**18.00** «100 мільёнаў».
**18.55** Нацыянальная музычная прэмія «Ліра».
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.50** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі».
**0.20 Камедыя «Няўдачлівыя».**

### СТБ

**6.05 Серыял «Студэнты 2».**
**7.40** «Анфас».
**7.55 Маст. фільм «Насця».**
**9.30** «Чыстая праца».
**10.30** «Далёкія сваякі».
**10.55** «Гэта мой дом».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.40 Маст. фільм «Піраты XX стагоддзя».**
**15.15** «Ваенная тайна».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** «Зброя багоў».
**18.25** «Разумней не прыдумаеш». «Белы сезон».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Помста».**
**22.20** «Зорны рынг. Бітва хітоў». «Кактэйль» супраць «Ліяна і тры малпы».
**23.35 Маст. фільм «Вясёлыя і загарэлыя».**
**1.10** «Глядзець усім!».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.45** «Зямля і неба».
**8.10** «Саюзнікі».
**8.35** «Сабака ў доме».
**9.00** «Скажыце, чаму?».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** Спецпраект «Калі ты ў бяспецы».
**10.40, 17.10 Маст. фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны».**
**2.00 Маст. фільм «Аддзел 13».**
**3.50 Маст. фільм «Свой сярод чужых. Чужы сярод сваіх».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.50 Маст. фільм «Правілы жыцця».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50 Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».**
**14.25 Серыял «Мора па калена».**
**16.20** «Гэта смешна».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.30 Маст. фільм «Таблетка ад слёз».**
**22.20 Маст. фільм «Пакліч і я прыйду».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05 Серыял «Гончыя».**
**6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25 Серыял «Дзяржаўная абарона».**
**16.20** «Прафесія — рэпарцёр».
**17.05** «Кантрольны званок».
**18.00** «Следства вялі...».
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**21.10** «Ты не паверыш!».
**22.15** «Соль і цукар. Смерць да густу». Навуковае расследаванне Сяргея Малазёмава.
**23.30** «Тайны кахання».
**0.20** «Мужчынская годнасць».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.15, 19.00, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** Тэлепрагноз.
**9.10** Мультпарад.
**9.30 Серыял «Рака».**
**11.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Камедыя «Жыццё як яно ёсць».**
**13.20 Трылер «Вяртанне героя».**
**15.15** «Кінаблакнот».
**15.25** «Тэлемагазін».
**15.55** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Меладрама «Усё не выпадкова».**
**18.05 Серыял «Эўрыка».**
**19.05 Трылер «Пустэльнік».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Стальны чалавек».**

## Лад жыцця

# Добрага чалавека мала не бывае?

**Вялікабрытанія лідзіруе ў Еўропе па колькасці прадстаўніц прыгожага полу да 20 гадоў з лішняй вагой. Такія звесткі прадставіў Каралеўскі каледж педыятрыі і здароўя дзяцей. Як заяўляюць урачы, па статыстыцы 26% хлопчыкаў і 29% дзяўчынак маюць залішнюю вагу, якая можа прывесці да ўзнікнення сур'ёзных праблем са здароўем у будучыні.**



Медыкі апублікавалі сваю справаздачу, каб прыцягнуць увагу ўлад да праблемы атлусцення моладзі. Як піша The Daily Mail, сярэдняя вага жыхара Вялікабрытаніі працягвае павышацца год ад году, што прыводзіць да вялікіх праблем.

Каралеўскі каледж прапануе абавязаць школы далучаць вучняў да актыўных заняткаў фізкультурай. Урачы патрабуюць забараніць рэкламу прадуктаў харчавання з высокай насычанасцю тлушчам, соллю і цукрам да дзевяці вечара, а таксама ўвесці абмежаванні на рэкламу ў інтэрнэце. Між тым стала вядома, што грэчаскія мужчыны займаюць першае месца сярод прадстаўнікоў моцнага полу еўрапейскіх краін з атлусценнем: больш за трэць маладых людзей тут маюць лішнюю вагу.



Раней Фонд падтрымкі аховы здароўя Амерыкі апублікаваў даклад з рэйтынгам атлусцення сярод насельніцтва ЗША. Аналітыкі прыводзяць несуцяшальныя факты: за мінулы год узровень гэтай хваробы не толькі не знізіўся, але і павялічыўся яшчэ ў шасці амерыканскіх штатах. Гэта новы гістарычны статыстычны максімум: ніколі раней не было такога, каб у 20 штатах ЗША трэць дарослага насельніцтва пакутавала на атлусценне. Лідзіруюць у рэйтынгу атлусцення сярод дарослага насельніцтва Місісіпі і Заходняя Віргінія (па 35% насельніцтва), і сітуацыя толькі пагаршаецца.



Даследчыкі звязваюць атлусценне не толькі з дэмаграфіяй, але і з паказчыкамі ўзроўню жыцця: амерыканцы, якія адносяцца да бедных слаёў насельніцтва, не маюць нармальнага доступу да карысных прадуктаў і часта вымушаны харчавацца фастфудам, адмаўляючы сабе ў свежай садавіне і гародніне. Выказваецца таксама думка, што ў сувязі з высокім узроўнем злачыннасці ў бедных кварталах у іх няма магчымасці здзяйсняць прагулкі ў парках, каб спаліць лішнія калорыі.

### ВТБ

**6.00, 6.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.15, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 19.30** Серыял «Варонiны».
**9.30, 13.30, 19.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**10.00** Серыял «Кухня 4».
**11.00** «Празорлівая».
**12.00** Серыял «Аманда О».
**13.00** Серыял «Супер Макс».
**14.00** «Знаёмцеся, мужчына!».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Трылер «Выкуп».
**18.30** «Лаві момант».
**20.00** Фантастыка «Галодныя гульні».
**23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** «Турба міксер».
**5.00** «Спатканне з густам».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Маст. фільм «Безыменная зорка».
**12.15** Вялікая сям'я. Вярцінскія.
**13.10** Дак. фільм «Снежны чалавек прафесара Поршнева».
**13.50** Пернікавы домік. «Жывое дрэва Інэсы і Рашыда Азбуханавых».
**14.20** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Дак. серыял «Нефрантавыя нататкі».
**14.45** Дак. фільм «Праваслаўе ў Грузіі».
**15.25** «Рамантыка раманса». Музычны Пецярбург.
**16.20** Маст. фільм «Музычная гісторыя».
**17.40** Канцэрт лаўрэатаў III Міжнароднага конкурсу вакалістаў імя М. Магамаева.
**19.20** Дак. фільм «Муслім Магамаеў. Незададзеныя пытанні».
**20.10** Спектакль тэатра «Майстэрня П. Фаменкі» «Ваўкі і авечкі».
**22.50** «Белая студыя». Уладзімір Косма.
**23.30** Кіно на ўсе часы. Маст. фільм «Грэк Зорба».
**1.55** Дак. фільм «Загадкавыя ракападобныя».
**2.50** Дак. фільм «Іеранім Босх».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 12.00, 0.00** Дак. фільм «Хто дыктуе моду?». 1986 год.
**6.40** Фільм-канцэрт «Рытмы эстрады». 1984 год.
**7.10** Тэлеспектакль «Гульцы». Камедыя М. Гогаля. 1978 год.
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 5.00** «Песня-91».
**12.30** Фільм-канцэрт «Вячэрнія мелодыі». 1985 год.
**13.20** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
**16.00** «Колба часу».
**17.05** Фрагменты праграмы «Кінапанарама». 1969 год. 1-я частка.
**18.00** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**18.35** «Што? Дзе? Калі?». Тэлевізійная гульня. Сезон 1983—1984 гг.
**19.40** Навагодні канцэрт з Маскоўскага дзяржаўнага Тэатра эстрады. 1-я частка. 1992 год.
**20.25** Ансамбль «Бярозка». Канцэртная праграма. 1962 год.
**21.00** Кінаканцэрт «Зніму рыцара, або Рыцары не здаюцца!». 1987 год.
**22.00** Маст. фільм «Руды, сумленны, закаханы». 1-я серыя.
**23.15** Фільм-канцэрт «Гады мірных здзяйсненняў». «Анталогія савецкай песні». 1977 год.
**0.40** Фільм-канцэрт «Аповед аб некалькіх днях». Гастролі Рыкарда Фолы ў Маскве. 1985 год.
**1.35** Спектакль тэатра «Сучаснік» «Хто баіцца Вірджыніі Вульф?». 2-я серыя. 1992 год.

### EUROSPORT

**10.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**11.30, 16.15, 20.30, 2.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**12.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Скіятлон. Жанчыны.
**13.15, 18.30, 1.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу.
**14.00, 19.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Хуткасны спуск. Мужчыны.
**15.30, 19.00, 1.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу.
**18.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету. Камандны спрынт.
**21.45** Баявыя майстэрствы.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 3.10** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**6.25, 10.00, 14.30, 17.30, 22.00** Серыял «Дваццаць дванаццаць».
**6.55** Прыгоды «Фантамас разбушаваўся».
**8.35** Камедыя «Два ў адным».
**11.05** Камедыя «Кур'ер».
**12.45** Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».
**15.35** Камедыя «Лары Краўн».
**17.10, 0.50, 2.50** Скетчком «Паміж намі».
**18.30** Камедыя «Канікулы Дзюкабою».
**20.20** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**23.10** Камедыя «А як жа Боб?».
**1.15** Камедыя «Сведка на вяселлі».
**4.00** Камедыя «Рымскія прыгоды».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00, 5.10** «Дом дагары нагамі».
**11.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.55** «Гісторыі выратавання».
**12.30** «Тайны нашага кіно. «Водпуск за свой кошт».
**13.05, 3.00** Маст. фільм «Водпуск за свой кошт».
**15.35, 2.20** Дак. фільм «Правілы дарожнай непавагі».
**16.30** «Свая праўда».
**17.30** Дак. фільм «Самасуд. Вока за вока».
**19.00** «Даўно не бачыліся!».
**20.20** Маст. фільм «Дзяўчынка».
**22.55** Маст. фільм «Кніга Ілая».
**0.50** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

### ТБ1000

**6.00** Камедыя «Людзі ў чорным».
**7.45, 16.55, 2.00** Камедыя «Людзі ў чорным 2».
**9.20** Баявік «Падарожжа да Цэнтра Зямлі».
**11.05** Камедыя «Мой маленькі анёл».
**12.45** Драма «Розум і пачуцці».
**15.05** Трылер «Уварванне».
**18.30** Меладрама «Бяспека не гарантуецца».
**20.00** Трылер «Добры доктар».
**21.40** Камедыя «Віхор».
**23.30** Баявік «Напруж звіліны».
**3.40** Трылер «Суіні Тод, дэман-цырульнік з Фліт-стрыт».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Фантастыка «Цяжка быць богам».
**8.40** Мюзікл «Снягурка».
**10.20** Камедыя «Рэальны тата».
**12.10** Камедыя «Пасля дожджычку ў чацвер».
**13.40** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**15.15** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**16.55** Жахі «Масакра».
**18.45** Меладрама «Прагулка па Парыжы».
**20.20** Камедыя «Марафон».
**22.30** Камедыя «Падарунак з характарам».
**0.10** Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
**2.20** Камедыя «Адно каханне на мільён».
**4.50** Драма «Дом з вежкай».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**7.00** Старацелі.
**8.00** Незвычайныя промыслы.
**9.00** Навука будучыні.
**10.00** Космас: Прастора і час.
**11.00, 18.00** Гульня ў лікі.
**12.00, 0.00** Больш чым фокусы.
**13.00** Першыя вялікія ўцёкі.
**14.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**15.00** Каралева гіен.
**16.00** Дзікія жывёлы Поўначы.
**17.00** У пошуках да Вінчы.
**21.00, 1.00, 4.00** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**23.00** Аб'ект сусветнай спадчыны.
**3.00** Кіраванне натоўпам.

### DISCOVERY

**8.00** Як гэта ўстроена?
**8.25, 15.35** У пагоні за класікай.
**9.15** Аляска: сям'я з лесу.
**10.10, 3.40** Голыя і напалоханыя.
**11.05** Дамы на дрэвах.
**12.00, 7.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**12.50, 22.00** Склады: бітва ў Канадзе.
**13.45, 6.10** Дарога да прыбытку.
**14.40** Хуткія і гучныя.
**16.30** Легендарны аўтамабіль.
**17.25** Дынама — сустрэча з ілюзіяністам.
**23.00** Дзённікі вялікай вайны.
**0.00** Трой.
**1.00** Інструкцыя па стварэнні.
**1.55** Як пабудаваць суперкар.
**2.50** Каралі сталярнай справы.
**4.30** Стальныя мышцы.
**5.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.45** Як гэта зроблена?

■ Памяць

# АДЗІН ЛЁС НА ДВАІХ

## Былы магілёўскі настаўнік Уладзімір Аладзьеў убачыў у славутым палітруку свайго бацьку

**Гэты здымак ваенных часоў, дзе палітрук падымае ў бой салдат, Уладзімір Аладзьеў бачыў і раней. Але калі на вочы трапіў аповед пра гэтага героя, як агнём апякло: «Дык гэта ж пра майго бацьку — Рамана Паўлавіча Аладзьева!»**

— Доўгі час пра героя на здымку амаль нічога не было вядома, а тут пра яго расказалі сваякі з Украіны, — тлумачыць наш чытач. — Глядзеў і не верыў сваім вачам. У малодшага палітрука Аляксея Яроменкі з фота і майго бацькі — адзін лёс на дваіх. Абодва працавалі ў сельскай гаспадарцы, абодва з першых дзён вайны абаранялі Радзіму, абодва былі палітрукамі. У іх нават адзін год нараджэння — 1906.

Уладзімір Аладзьеў кажа, што бацька заўсёды быў прыкладам для яго і двух старэйшых братоў. Ён нарадзіўся ў працавітай сям'і ў вёсцы Падняжанне Александрыйскага сельсавета Шклоўскага раёна. З дзяцінства дапамагаў бацьку па гаспадарцы, рана спазнаў нялёгкую працу хлебароба. Калі ў 30-я гады ў вёсцы заснавалі першы калгас, землякі аднагалосна абралі яго старшынёй. Маўляў, чалавек пісьменны, 7 класаў скончыў. А галоўнае, працаваць умее і з людзьмі заўсёды агульную мову можа знайсці. А паколькі калгасы справай былі новай, шукалі чалавека, які б мог неяк пераканаць насельніцтва, што агульнае не так ужо і дрэнна. Дзеля гэтага не шкада прынесці ў ахвяру асабістае. На жаль, не кожны мог з лёгкім сэрцам расстацца з тым, што яшчэ ўчора належала аднаму яму. Прыходзілася шукаць нейкія пераканаўчыя аргументы.



Лепшыя работнікі Варанянскай МТС на ВДНГ у Маскве (Раман Аладзьеў першы злева).

І старшыня знаходзіў. Праўда, аднойчы, калі яго выклікалі ў райкам партыі, жыхары хуценька разабралі кароў па дамах. Кіраўнік вярнуўся, а гаспадаркі няма. Прыйшлося зноў пачынаць з нуля. А раённае кіраўніцтва зрабіла яму вымову за «палітычную блізарукасць».

Здараліся і выпадковыя канфузы. Захавалася сямейная гісторыя пра тое, як аднойчы вясковыя «граматэі» ледзь не падвялі свайго калгаснага старшыню пад трыбунал. На лозунгу замест «Разгорнем ударніцкі фронт» напісалі памылкова правакацыйнае «Разгонім ударніцкі фронт». Добра яшчэ, што Раман Аладзьеў своечасова ўбачыў памылку, і яе выправілі.



Палітрук Раман Аладзьеў.

Да вайны старшыня калгаса паспеў уступіць у шэрагі партыі і скончыць партшколу. Працаваў старшынёй сельсавета, інструктарам Круглянскага райкама партыі. Адтуль, дарэчы, і пайшоў на фронт палітруком роты стралковай дывізіі. І таксама самааддана, як дагэтуль, агітаваў народ уступаць у калгасы і працаваць на карысць дзяржавы, пачаў ваяваць. Пад Масквой, калі загінуў камандзір роты, Раман Аладзьеў падымаў у атаку байцоў. Як легендарны Аляксей Яроменка на здымку.

— У тым баі пад Нарафамінскам бацька быў паранены і трапіў у шпіталь, — расказвае Уладзімір Аладзьеў. — Пасля зноў стаў у строй і дайшоў да Эстоніі. Там нават у Дзень Перамогі працягваліся жорсткія баі па разгроме Курляндскай групоўкі ворага. Дадому гвардыі маёр Раман Аладзьеў вярнуўся ў 1946 годзе. На яго кіцелі блішчэлі ордэны Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў, медалі за абарону Масквы і Перамогу над Германіяй.

Пасля вайны былы франтавік падымаў народную гаспадарку, працаваў на розных партыйных пасадах. Калі міністр сельскай гаспадаркі БССР Сяргей Сікорскі накіроўваў яго ў Астравецкі раён (тады яшчэ Маладзечанскай вобласці) на пасаду намесніка начальніка палітаддзела Варанянскай МТС, Аладзьеў выказаў гатоўнасць узяць на сябе і большую адказнасць. Міністр крытычна глянуў на яго і... даў «дабро» ўзначаліць палітаддзел. У пачатку 50-х Аладзьеў у ліку лепшых работнікаў узорнай па ўсіх паказчыках МТС пабываў на ВДНГ у Маскве. Са сталіцы ён прывёз жонцы Марыі Адамаўне прыгожую хустку і кашулю, а дзецям шакаладныя цукеркі. Іх смак Уладзімір Раманавіч згадвае дагэтуль.

Некаторы час былы палітрук працаваў у легендарным калгасе Магілёўшчыны «Зара». Аднойчы тут адбыўся страшны пажар, па недаглядзе вартаўніка згарэла цэлая ферма разам з каровамі. Гэта пакінула цяжкі адбітак на яго душы. Сын успамінае, што доўгі час слова «пажар» выклікала ў бацькі сапраўдны жах. У вёсцы, дзе яны тады жылі, па суседстве быў клуб — там па вечарах круцілі кіно. Дзеці чакалі моманту, калі ў вокнах запаляць святло, каб бегчы хутчэй са сваімі зэдлікамі на кінапрагляд. Аднойчы чаканне зацягнулася аж да 11-й гадзіны вечара. Нарэшце з акна свайго дома браты ўбачылі, што ў клубе ўключылі свет і радасна закрычалі: «Гарыць!» Бацька, як укушаны, падхапіўся з ложка і з крыкам: «Дзе гарыць?» кінуўся да дзвярэй. Сыны ледзь паспелі яго перахапіць, каб не пабег шукаць, каго ратаваць.

— Ён ніколі не жыў напаўсілы, гатовы быў усяго сябе аддаць за справу, — кажа Уладзімір Раманавіч.

Каб аддаць даніну павагі свайму бацьку, ён стварыў радаслоўную, дзе перапісаў продкаў аж да шостага калена. Асобна вылучыў заслугі сваіх бацькоў, якія выхавалі трох сыноў сапраўднымі патрыётамі. Старэйшы Мікалай за сваю самаадданую працу быў адзначаны працоўнымі ўзнагародамі і ганаровым званнем «Ударнік камуністычнай працы». Сярэдні Георгій пайшоў па бацькоўскіх слядах у сельскую гаспадарку, працаваў галоўным аграномам, на розных пасадах у Магілёўскім аблвыканкаме. Пра сябе Уладзімір Раманавіч сціпла адзначыў: «Працаваў пасля педінстытута настаўнікам біялогіі і хіміі. Імкнуўся сеяць разумнае, добрае, вечнае».

**У малодшага палітрука Аляксея Яроменкі з фота і майго бацькі — адзін лёс на дваіх. Абодва працавалі ў сельскай гаспадарцы, абодва з першых дзён вайны абаранялі Радзіму, абодва былі палітрукамі. У іх нават адзін год нараджэння — 1906.**

Аднойчы, пачуўшы пра конкурс «Зазірніце ў сямейны альбом», які праводзіла Цэнтральная гарадская бібліятэка Магілёва імя К.Маркса, зрабіў фотакалаж у гонар свайго бацькі. Тыя фотаздымкі на стэндзе з гераічным надпісам «Лёс чалавека — у лёсе Магілёўшчыны» ўбачылі шмат магіляўчан.

— Бацька вельмі ганарыўся тым, што быў камуністам, — кажа яго сын. — Цяпер моладзь скептычна ставіцца да гэтага слова. Але сэнс не ў слове, а ў тым, як чалавек ставіўся да справы. А за сваю біяграфію ні яму, ні яго дзецям сорамна ніколі не было. Першым заўсёды цяжка, але гэта яго не пужала. І ў нашай з братамі памяці ён застаўся ўзорам, як трэба жыць і працаваць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сямейнага архіва Уладзіміра Аладзьева**

ОАО «Амкодор-КЭЗ»
*Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества*
**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**
Собрание состоится 22 декабря 2014 г. в 14.00 по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества.
Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.55.
Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, — 16 декабря 2014 года.
**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. Об увеличении уставного фонда Общества за счет источников собственных средств.
2. О внесении изменений в устав Общества.
3. Об увеличении уставного фонда Общества путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем создания закрытой подписки.
Основание созыва собрания — решение Совета директоров Общества от 10 декабря 2014 года.
С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 16 декабря 2014 года, в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.
Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность или договор).
УНП 300028841
*Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ»*

22 декабря 2014 г. в 10.30. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».
Повестка дня:
1) О совершении сделок общества.
2) О выпуске облигаций общества.
Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.
Время регистрации в день проведения собрания: с 10.00 до 10.30.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 15.12.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
УНП 200295903
Совет директоров.

■ Неасабісты суб'ектыў



# АДАМАВЫ РЭБРЫ

## Тэорыя эвалюцыі ў бяздзеянні

СУСЕДЗІ зверху зноў зладзілі пасярод ночы «баль». А палове чацвёртай над галавой моцна грукнула і пранізліва закрычала жанчына. Мужчынскі голас нешта глуха і коратка прабубнеў ёй у адказ, і пачуўся гук удару. «Зноў ён яе б'е», — прывычна-ляніва падумалася скрозь сон. Сон, праўда, хутка прайшоў, пачала пільна прыслухоўвацца, ці не раздадуцца сярод адчайнага жаночага ляманту крыкі аб дапамозе. Не. Яна на працягу гадзіны лётала па кватэры і галасіла. Ён яе даганяў то ў прыхожай, то на кухні, то ў пакоі, коратка нешта гаварыў і лупіў. Мяркуючы па гуках, і нагамі, і галавой аб сцяну. А палове пятай усё сціхла гэтаксама раптоўна, як і пачалося. Можна было спакойна заснуць яшчэ хоць на паўтары гадзінкі.

Не спяшайцеся папракаць мяне ў абыякавасці і чэрствасці: маўляў, побач з табой чалавека, можна сказаць, забівалі, а ты толькі і думала, як бы яшчэ паспаць. Справа ў тым, што ўсё гэта мы ўжо праходзілі. Як толькі новыя суседзі — прыстойная маладая пара — засяліліся, я і мае дамашнія набралі ў грудзі паветра, каб уздыхнуць з палёгкай. (Тыя, каму пашчасціла жыць побач з кватэрай, якая здаецца кватарантам, зразумеюць, пра што я. Астатнім гэтага разумення і ведання я проста ад усёй душы не жадаю.) Уздыхнуць не ўдалося — праз два дні сярод ночы разгарэўся такі гучны скандал з яўным рукапрыкладствам (які мог скончыцца ці забойствам, ці калецтвам), што нічога іншага, чым набраць нумар «102», нават у галаву не прыйшло... Хвілін праз дваццаць мне пазваніла міліцэйскі дыспетчар і паведаміла, што нарад на месца выязджаў, дзверы ім адчынілі абое, пераканалі, што ўсё нармальна, паабяцалі больш уначы не шумець. Карацей, беларускі варыянт «Містара і місіс Сміт». А «сіняя панчоха» знізу зайздросціць і міліцыю выклікае...

ЯБАЧЫЛА яе назаўтра. Рассечаныя вусны, дарэмная спроба замаскіраваць танальным крэмам сіняк на скіўцы. З ліфта яна выйшла неяк бокам — пэўна, трапіла і па нырках або па жываце. Варыянт «эратычных гульняў» адпаў сам сабой. Таму, калі праз тыдзень «паказальныя выступленні» пачаліся яшчэ з большым гукавым суправаджэннем, я ўжо была больш настойлівай, калі выклікала міліцыю ў тры гадзіны ночы.

Яна назаўтра прыйшла да мяне сама. Гэтым разам у яе быў рассечаны лоб — пэўна, махануў аб вушак. Напрамілы бог прасіла больш не выклікаць міліцыю. Бо заявы на «дарагога чалавека» (яе словы!) яна ўсё роўна пісаць не будзе, а ноччу больш пастараецца нас не будзіць. Я глядзела на яе тоненькую фігурку, заплаканыя вочы (і пры ўсім гэтым — добры манікюр, дагледжаныя валасы, брэндавая вопратка — яны не маргіналы, не п'яніцы, абое добра зарабляюць) і адзіным аргументам, які знайшла, было «ён жа вас калі-небудзь заб'е». Яна ўсміхнулася і ці то жартам, ці то ўсур'ёз сказала: «Ну вось калі буду крычаць «ратуйце, забіваюць», тады і званіце ў міліцыю».

Вось так і жывём ужо паўгода. Я іх часта бачу — то ў краме, то на стаянцы, калі садзяцца ў сваё дарагое аўто. З выгляду — прыстойныя і шчаслівыя маладыя людзі, клапатлівы муж, які адчыняе дзверы і нясе цяжкія сумкі, прыгожая жонка, якая за ім — бы за каменнай сцяной. А пасля (яе словы) ён становіцца як шалёны. Можа прычапіцца да чаго заўгодна. Да недагрэтай або перагрэтай ежы, да жарту, які здаўся крыўдным, да таго, што надоўга заняла ванны пакой. І тады ў іх кватэры наступае жахлівая ноч, пра якую ведаюць толькі яны ды суседзі знізу, якія паабяцалі выклікаць міліцыю толькі ў крайнім выпадку.

